Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) ◈ 17(125) ◈ 28 красавіка 1993 г. ◈ Кошт — па дамоўленасці.

ПОСТУП ТЫДНЯ

26 КРАСАВІКА СПОЎНІЛАСЯ 7 ГАДОЎ З ДНЯ КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС. У газетах з'явілася пастанова Савета Міністраў РБ ад 8 красавіка 1993 года «Аб памерах дапамог і даплат насельніцтву, якое пацярпела ў выніку чарнобыльскай катастрофы». Але ніякія грошы здароўя не вернуць.

●

МЕНСК НАВЕДАЛА ПОЛЬСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ НА ЧАЛЕ З МІНІСТРАМ АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧЫ ЯНУШАМ АНУШКЕВІЧАМ. Дэлегацыя сустрэлася са Старшынёй Вярхоўнага Савета і Старшынёй Савета Міністраў. Міністры абароны дзвюх суседніх дзяржаў падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве Польшчы і Беларусі ў ваеннай сферы. У час сустрэчы з С. Шушкевічам пан Анушкевіч заявіў, што НАТА для Польшчы з'яўляецца гарантам бяспекі. А для нас Расія?

●

АДДЗЕЛ ІНФАРМАЦЫІ МЗС РЭСПУБЛІКІ ПАВЕДАМІЎ, што святы айцец папа рымскі Іаан Павел II назначыў яго вялікасць архіепіскапа Габрыеля Мантальва апостальскім нунцыем у Рэспубліцы Беларусь.

●

УПЕРШЫНЮ ЗА 42 ГАДЫ СВАЙГО ІСНАВАННЯ У БЕЛАРУСІ ВЫЙШЛА ГАЗЕТА «БЕЛАРУС», якую ў ЗША выпускае Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне. Набыць газету можна ў Менску ў кіёсках ТБМ, «Выбранецкіх шыхтоў», а таксама ў Задзіночанні беларускіх студэнтаў.

●

У КІНАТЭАТРЫ «МАСКВА» АДКРЫЎСЯ Другі міжнародны кінафестываль «Жанчына ў кіно». У ім бяруць удзел жанчыны, рэжысёры, аператары, сцэнарысты з Беларусі, краін СНД, далёкага і блізкага замежжа. Сенсацыйным чакаецца стаць дакументальны фільм «Вызваліцелі і вызваленыя», які зняла нямецкі рэжысёр Х. Зандэр. У фільме даследуецца лёс жанчын, якія пацярпелі ад гвалту савецкіх салдат у час уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Германіі.

Ці стоміцца язык ад балбатні пра двухмоўе? Стар. 2

НЕ ПАЛЕШУКІ, А БЕЛАРУСЫ Стар. 3

БНР БЫЛА РЭАЛЬНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ Стар. 4



Пачатак красавіка ў Беларусі прайшоў пад лозунгамі «Не — вайсковаму саюзу з Расіяй». Але ні лозунгі, ні мітынгі ў абарону нейтралітэту нашай краіны, ні заявы супраць вайсковага саюза многіх грамадскіх і дзяржаўных устаноў і арганізацый, ні збор подпісаў не пахіснулі пракамуністычную большасць Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у прыняцці рашэння далучыцца да дагавору «Аб калектыўнай бяспецы». 5 красавіка 1993 года Беларускі цэнтр сацыяльнага і палітычнага прагнозу правёў апытанне 1103 рэспандэнтаў з мэтай высветліць адносіны народа да захавання Рэспублікай Беларусь нейтралітэту, які прадугледжвае адмову ад уступлення ў любыя ваенна-палітычныя саюзы. За нейтралітэт — 54,9%, супраць — 27,2%, цяжка адказаць — 17,9%. Ёсць спадзяванне, што калі адбудзецца рэферэндум аб захаванні Рэспублікай Беларусь нейтралітэту, то беларускія хлопцы не будуць гінуць за чужыя інтарэсы.

Фота Л. ЛІПЕНЯ.

НЕ ваеннаму саюзу

● *У суполках ТБМ* ●

НОВЫ СТАТУС ІНСТЫТУЦКАЙ СУПОЛКІ

Суполка ТБМ імя Ф. Скарыны ў Беларускім тэхналагічным інстытуце (старшыня — кандыдат хімічных навук, дацэнт Я. Міляшкевіч) па заслугах лічыцца адной з лепшых, якія існуюць у ВНУ нашай рэспублікі. У адпаведнасці з загадам рэктара інстытута прафесара І. Жарскага тут яшчэ са студзеня мінулага года справаводства і справаздачнасць вядуцца па-беларуску, плённа працуюць пастаянныя курсы роднай мовы для супрацоўнікаў інстытута, а для прафесарска-выкладчыцкага саставу створаны свой універсітэт беларускай мовы, гісторыі і культуры (загадчык — доктар тэхнічных навук, прафесар А. Саламонаў). Летась «Наша слова» ўжо знаёміла чытачоў са значным пашырэннем беларускасці ў БТІ. Але час, як вядома, бяжыць, і актывісты ТБМ інстытута комплексна вырашаюць новыя праблемы, каб у самы бліжэйшы перыяд планамерна ажыццявіць пераход усяго навучальнага працэсу на родную мову, каб па ўсіх паказчыках БТІ стаў сапраўды беларускім. Са свайго вопыту сябры суполкі сакрэтаў не робяць. Таму сюды зноў запрасілі карэспандэнта газеты.

Пераступіўшы парог аднаго з карпусоў Беларускага тэхналагічнага, адразу пераконваешся, што гэты інстытут усё больш набывае рысы нацыянальнай ВНУ. Так, шыльды адміністрацыйных памяшканняў, аўдыторый і лабараторый выкананы па-беларуску. Пакоі былога парткама зараз прыстасоў-

(Заканчэнне на с. 3).

Ці стоміцца язык ад балбатні пра двухмоўе?

Не буду варажыць, ці ён зрабіў гэта наўмысна, ці перад тым, як падысці да мікрафона, чуў звон, ды не ведаў, дзе ён. Але ўпэўнены, што прамоўца надта жадаў, каб усё было менавіта так, як казаў. Казаў жа ён (вядома, па-расійску) прыкладна вось што: у Казахстане вельмі разважліва падышлі да моўнага пытания — рашылі надаць рускай мове статус дзяржаўнай. Вось, маўляў, вопыт, варты пераймання!

Сапраўды ж, у той час (гэта было ў кастрычніку мінулага года) яшчэ толькі абмяркоўвалі праект Асноўнага закона Казахстана і ніякага канчатковага рашэння быць не магло. А вось у нядаўна прынятай у Алма-Аце Канстытуцыі рэспублікі дзяржаўнай мовай аб'яўлена якраз толькі казахская. І гэта, дабаўлю ад сябе, нягледзячы на тое, што казахі складаюць там толькі дзве пятыя ад агульнага ліку жыхароў і іх значна менш, чым рускамоўных. Нашым заканадаўцам, сапраўды, не пашкодзіла б павучыцца ў сваіх калег, як трэба абараняць мову карэннай нацыі ў яе ўласным доме.

Я не ведаю, ці прасіў той дэпутат прабачэння за падман усіх, хто яго слухаў. Ды шчыра кажучы, не чакаў гэтага: нашы парламентарыі маральнасць нярэдка падпарадкоўваюць інтарэсам сваёй палітычнай барацьбы. Затое спадзяваўся, што беларускія газеты праінфармуюць чытачоў, як вырашалася пытанне аб мовах у згаданай краіне. Яна ж адзіная з былых саюзных рэспублік (не лічачы Беларусі). у якой была рэальная пагроза ўвядзення двухмоўя. На жаль, аб гэтым давялося прачытаць толькі ў маскоўскім незалежным друку.

У дэпутацкіх прамовах, як, дарэчы. і ў розных рускамоўных выданнях рэспублікі, робяцца спасылкі і на тое, што ў дзесятках краін свету дзяржаўнымі з'яўляюцца дзве і больш моў. Наконт колькасці аўтары гэтых выказванняў маюць рацыю: з дапамогай даведачнай літаратуры я налічыў звыш сарака такіх краін. Але гэта толькі адзін бок медалі. Пра адваротны прыхільнікі двухмоўя лічаць за лепшае прамаўчаць. Чаму так?

Усе гэтыя дзяржавы (за выключэннем некаторых краін, напрыклад Швейцарыі або Бельгіі, дзе кампактна

●

Ёсць у беларусаў старадаўняя прымаўка: «Мялі, васпане, пакуль язык не прыстане». Яна нагадваецца, калі, бывае, слухаеш па радыё ці тэлебачанні выступленне якога-небудзь народнага выбранніка. На жаль, насуперак сэнсу афарызма той-сёй усур'ёз успрымае такога «васпана», дакладней, тое, што ён мовіць. Паверылі ж некаторыя «вутцы», якую пусцію адзін дэпутат з парламенцкай трыбуны (прозвішча, прабачце, не памятаю), калі абмяркоўвалі праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

●

пражываюць два-тры народы) — колішнія калоніі, якія здабылі незалежнасць галоўным чынам пасля Другой сусветнай вайны. Няцяжка здагадацца, што мовы былых метраполій маюць там афіцыйны статус. І таму ў нас могуць узнікнуць непажаданыя для шмат каго асацыяцыі...

Гаворачы пра гэта, нельга абысці такія еўрапейскія краіны, як Ірландыя і Фінляндыя. Пра першую дэпутаты-«звышінтэрнацыяналісты» памоўчваюць, бо там англійскія заваёўнікі зрабілі з ірландскай мовай тое, што ў нас русіфікатары — з беларускай. І ў існуючым двухмоўным асяроддзі справа не паляпшаецца, хаця Ірландыя ўжо болей за сорак гадоў — суверэнная рэспубліка.

Што да Фінляндыі, дык яе беларусафобы любяць ставіць у прыклад. Слухайце, гавораць яны сваім апанентам: там няма ніякіх праблем з-за таго, што, акрамя фінскай, афіцыйны статус мае і шведская мова. Слухайце і матайце сабе на вус... Гэтыя сентэнцыі разлічаны на недасведчаных або забыўлівых людзей. Так, праблем там няма: ніхто і нішто не пагражае цяпер мове фінскага народа. Але ці ўсе ведаюць або памятаюць, у якім жахлівым стане яна знаходзілася ў часы шматвяковага панавання Швецыі над фінамі? Дастаткова сказаць, што выкладанне ў школах вялося толькі на шведскай мове, якая насаджалася ў якасці дзяржаўнай, што на мове карэннага насельніцтва забаранялася друкаваць усё, акрамя рэлігійнай ды сельскагаспадарчай літаратуры. Калі краіна Суомі была далучана да Расійскай імперыі, у ёй узмацніўся рух за развіццё нацыянальнай культуры і мовы. Але апошняя стала дамінуючай ва ўсіх сферах жыцця толькі пасля атрымання Фінляндыяй незалежнасці.

Шведызацыя і русіфікацыя (а раней паланізацыя) — аднаго поля ягадкі. Аднак жа нашы заканадаўцы, аб'явіўшы суверэнітэт рэспублікі, не імкнуцца адрадзіць мову беларусаў, а спяшаюцца спачатку прынізіць матчына слова, а потым зусім выкараніць яго.

Што ж, у свеце налічваецца больш за сем дзесяткаў краін, дзе афіцыйнай з'яўляецца толькі мова ўчарашняй ці сённяшняй метраполіі. Ды гэта, лічу, не козыр для непрыхільнікаў беларушчыны: мовы тубыльцаў або яшчэ не маюць сваёй пісьменнасці, або атрымалі яе параўнальна нядаўна.

Дык куды клічуць нас змагары за поўную русіфікацыю Беларусі? Да каго хочуць прыпадобніць? Наша ж беларуская мова была дзяржаўнай яшчэ ў Вялікім княстве Літоўскім, нашы продкі адкрылі першы універсітэт ва Усходняй Еўропе (амаль за два стагоддзі да заснавання Маскоўскага), наш Францішак Скарына на паўвека раней, чым рускі першадрукар, пачаў выдаваць свае кнігі.

Вялікія духоўныя страты панеслі беларусы за апошнія стагоддзі і дзесяцігоддзі. І грэх нам не выкарыстаць яшчэ не згублены шанц для нацыянальнага Адраджэння. Трэба браць прыклад з тых народаў, якія здолелі ўваскрэсіць сваю мову, раўняцца на тыя цывілізаваныя краіны, дзе статус афіцыйнай мае толькі мова, якая дала назву дзяржаве і з'яўляецца, зразумела, роднай мовай для асноўнага насельніцтва.

...Цяжка разлічваць, што дэпутаты з каланіяльным мысленнем ды імперскай арыентацыяй, былыя і цяперашнія наменклатуршчыкі «поступятся принципами» ды штосьці зробяць, каб хутчэй адрадзіліся нашы нацыя і мова. Дык, можа, хоць дачакаемся, калі ў іх язык прыстане ад балбатні пра двухмоўе?

Генадзь ЛАГУНОВІЧ,
ветэран вайны і Узброенных Сіл.

На Украіне я стаў «чужынцам», а Беларусі не патрэбны

Тое, што прэзідэнт Краўчук не падпісаў Статут Садружнасці Незалежных Дзяржаў успрынята ўкраінскімі нацыяналістамі як «перамога над імперыяй». Гэта іхняя справа. Але апошнім часам усё больш дастаецца мне, таму што звыш дзесяці гадоў выкладаю ў школе расійскую мову. Заўсёды, як толькі Шушкевіч з Кебічам падтрымаюць Ельцына ці яшчэ якога дзеяча з «Усходу» і не падтрымаюць Краўчука, у школе ўспамінаюць пра мяне, бо «мае кіраўнікі», бач, выступаюць «супраць Украіны». А нядаўна дырэктар школы, які раней праслаўляў КПСС —КПУ, а цяпер стаў ярым нацыяналістам, паведаміў зларадна: «Уся Украіна ў тваім Мінску дала зразумець, што назад у імперыю не збіраецца, а з Кіева прыйшла цыдулка. што з верасня 1993 года расійскай мовы застанецца па адной гадзіне на тыдзень у V—IX класах, а ў I—IV класах на яе ранейшае месца ўводзяцца англійская і нямецкая. Так што працы вам не будзе. Раю вяртацца да сябе на абруселую Беларусь — там для расійскай мовы заўсёды будзе давацца ў школе шмат гадзін. Бо яна ж вам даражэй за родную». Уявіце сябе, шаноўнае спадарства, на маім месцы. Я ўжо два гады сапраўды спрабую вярнуцца на Беларусь, каб выкладаць там не расійскую. а родную мову, але, апроч выдаткаў на безліч аб'яў, абмен кватэры не атрымліваецца. Пісаў ужо і Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевічу і намесніку Старшыні Савета Міністраў сп. Дземчуку. А ў адказ прыйшлі мне звычайныя адпіскі з парадамі... памяняць кватэру на Беларусь. Як быццам я гэтага сам не ведаю!!!

Была нейкая спадзяванка на Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», якое ладзіла Сход беларусаў бліжняга замежжа, напісаў ліст спадару Лозку з просьбай даслаць мне запрашэнне, але ад спадара Лозкі ні гуку. Вось так і атрымліваецца, што ў беларускай прэсе «патрыёты» ўзнімаюць лямант. што няма каму вучыць дзяцей беларускай мове, а як даходзіць да практычнай дапамогі чалавеку. які хацеў бы паспрыяць беларускаму Адраджэнню, усе «выціраюць рукі». І атрымліваецца, што на Украіне я чужынец, бо вучу дзяцей-украінцаў чужой мове, і Беларусі я не патрэбен, бо там няма каму дапамагчы мне вярнуцца на Бацькаўшчыну. Цяпер даводзіцца распрацоўваць два «запасныя» варыянты адыходу з Украіны: у Карэлію, дзе мне даюць **стаўку завуча школы і паўстаўкі за выкладанне расійскай мовы, і маю прапанову на абмен кватэры з Махачкалой.** дзе ёсць дамоўленасць аб месцы карэспандэнта ў адной з рэспубліканскіх газет. Так што ў гэтым годзе я так ці інакш адсюль з'еду. Прыкра толькі, што з'еду не на Бацькаўшчыну, а зноў — у эміграцыю, на гэты раз у Расію, бо свая Бацькаўшчына не хоча вяртання назад беларускіх патрыётаў, тых, хто і ў эміграцыі захаваў любоў да яе, любоў да сваёй роднай мовы, культуры, гісторыі...

Пішу апошні ліст-зварот да шырокай беларускай грамадскасці, і калі і пасля яго мой голас застанецца не пачутым, назаўсёды, відаць, давядзецца застацца эмігрантам, бо мне ўжо 49 гадоў будзе ў красавіку, я стаміўся ад чаканняў-спадзяванняў. А мне б на Беларусі аднапакаёвую кватэру і стаўку выкладчыка роднай мовы і літаратуры!

Пятрусь КАПЧЫК,
выкладчык рускай і польскай моў.

г. Ізяслаў Хмяльніцкай вобл.

Патрэбны толькі час і праца

Свята, прысвечанае заканчэнню тыдня беларускай мовы і літаратуры, адбылося ў сярэдняй школе г.п. Радашковічы. Вучні розных класаў паказалі народныя абрады: «Купалле», «Сустрэча вясны», «Масленіца», інсцэніроўку народнай казкі пра скупога пана. Яны чыталі вершы, спявалі беларускія народныя песні. На заканчэнне прапанавалі ўрывак з бессмяротнай «Паўлінкі».

Зусім нядаўна школа пераехала ў новы будынак. Вельмі прыемна і важна, што ў новай школе адчуваецца сам дух Беларусі. Кожнага ля ўвахода сустракае наш бел-чырвона-белы сцяг. Актавая зала таксама ўпрыгожана нацыянальнай сімволікай Рэспублікі Беларусь. Добра працуюць настаўнікі беларускай мовы і літаратуры школы, якія падрыхтавалі і правялі тыдзень роднай мовы і літаратуры. Гэта Ірына Анатольеўна Савіцкая, Ніна Аляксееўна Багіно, Галіна Дзмітрыеўна Невяровіч. Асабліва адзначаю выкладчыцу англійскай мовы Валянціну Андрэеўну Беразняцкую. Са сваімі вучнямі яна адраджае ўсе народныя абрады і звычаі. Плённа працуе на ніве Адраджэння і настаўніца пачатковых класаў Валянціна Рыгораўна Шарамет.

«Новы будынак надаў новыя сілы настаўнікам, падцягнуў вучняў»,— гаворыць намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Іна Міхайлаўна Шураева.— У настаўнікаў многа добрых, цікавых задум, патрэбны толькі час і праца, каб іх ажыццявіць». Пажадаем ім поспехаў.

Мікола ЛІННІК,
старшыня бацькоўскага камітэта школы.

г.п. Радашковічы.

«Урок мужнасці» ў гімназіі

Нядаўна патрыятычныя згуртаванні і суполкі Маладзечаншчыны звярнуліся праз друк да грамадзян рэспублікі з прапановай правесці «Дзень мужнасці», прысвечаны 130-ым угодкам паўстання Кастуся Каліноўскага. 26 лютага такі «Дзень мужнасці», а дакладней, «Урок мужнасці» адбыўся ў Маладзечанскай беларускай гімназіі, у якім прынялі ўдзел народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Яўген Цумараў і старшыня маладзечанскага аддзялення ТБМ імя Францішка Скарыны настаўнік гісторыі Лявон Цімохін. Ён расказаў прысутным аб вызваленчай барацьбе беларускага народа ў 1863—1864 гг., якую ўзначаліў нацыянальны герой Кастусь Каліноўскі. У цікавым і змястоўным выступленні Яўген Цумараў заклікаў настаўнікаў і вучняў берагчы Бацькаўшчыну, духоўныя здабыткі і родную мову народа. Аднак, калі вучні старэйшых класаў пачалі задаваць гасцям пытанні, выявілася прыкрая акалічнасць: большасць школьнікаў скептычна адносіцца да гісторыі Беларусі і не валодае роднай мовай. Стала відавочным, што ў навастворанай беларускай гімназіі настаўнікам патрэбна будзе шмат працаваць, каб выхаванцы набылі належныя веды па роднай мове, а таксама павагу да яе. Дамагчыся ж гэтага педагогі змогуць у тым выпадку, калі самі будуць любіць і ведаць гісторыю і мову свайго народа. Будзем спадзявацца, што з цягам часу Маладзечанская гімназія стане беларускай у сапраўднасці, а не на паперы.

М. КАПЫЛОВІЧ.

Знікне мова, знікне і нацыя

ЗВАРОТ

да Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

У апошні час у перыядычным друку, па радыё, на пасяджэннях Вярхоўнага Савета гучаць выступленні супраць дзяржаўнасці беларускай мовы, заклікі да перагляду Закона аб мовах, да ўвядзення дзяржаўнага двухмоўя.

Мы з абурэннем асуджаем гэтыя ганебныя выпады супраць беларускага народа; кваліфікуем іх як свядомы падрыў незалежнасці беларускай дзяржавы.

Каб родная мова заняла «пачэсны пасад між народамі», прапануем: 1. Унесці ў Канстытуцыю рэспублікі артыкул аб наданні беларускай мове статуса адзінай дзяржаўнай мовы, аб недапушчэнні дзяржаўнага двухмоўя; 2. У мэтах паскарэння і адказнага выканання Закона аб мовах, аб'явіць 1993 г. годам беларускай мовы; 3. Устанавіць кваліфікацыйны экзамен па беларускай мове для кіраўнікоў, установы якіх завяршаюць пераход на дзяржаўную мову; 4. Не дапусціць правядзення рэферэндуму аб мовах.

Старшыня Гродзенскай раённай рады
Таварыства беларускай мовы
імя Ф. Скарыны І. Ф. БУДНІК.

У студзені 1990 года Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон аб мовах. Прайшло тры гады, а зроблена вельмі мала. Больш таго, у апошні час у сродках масавай інфармацыі пачалася атака на беларускасць. Гучаць патрабаванні, каб у Беларусі статус дзяржаўнай мовы быў нададзены і рускай мове. Дзеля чаго гэта робіцца? На Беларусі ведаюць рускую мову ўсе, таму ёй тут абсалютна нічога не пагражае.

А цяпер паглядзіце на стан роднай мовы ў нашай Бацькаўшчыне (мы ўжо не гаворым пра Расію, дзе няма ніводнай беларускай школы, не выдаюцца кнігі на беларускай мове, хаця там жыве мільён беларусаў). За гады Савецкай улады Беларусь была моцна зрусіфікавана. Ва ўсіх ВНУ, тэхнікумах навучанне вялося толькі на рускай мове. Амаль не засталося беларускамоўных школ. Большасць газет выдавалася на рускай мове, па радыё і тэлебачанні рэдка гучала беларускае слова. Таму значная частка беларусаў забыла сваю родную мову, якая амаль поўнасцю выціснута рускай. А калі знікне мова, то знікне культура, знікне і нацыя. А мы, беларусы, хочам жыць, хочам, каб нас паважалі ў свеце.

Шаноўныя народныя дэпутаты, не станьце магільшчыкамі Бацькаўшчыны! Не забірайце ў беларусаў самае дарагое — мову продкаў! Дзяржаўнай мовай у Рэспубліцы павінна быць толькі адна — беларуская.

Выкладчыкі і студэнты Гродзенскага медінстытута, члены суполкі «Наша спадчына», прафесар У. С. Васільеў, дацэнт Д. Т. Кулеш, прафесар Т. К. Лукашык, дацэнт М. П. Стасевіч і інш. (23 подпісы).

Аналагічны зварот да Вярхоўнага Савета прынялі ўдзельнікі Рэспубліканскага семінара выкладчыкаў літаратуры педагагічных вучылішчаў Беларусі (падпісала 17 чалавек).

Новы статус інстытуцкай суполкі

(Заканчэнне. Пачатак на с. 1).

ваюцца для стацыянарных заняткаў універсітэта беларускай мовы, гісторыі і культуры. Са сцен зніклі абрыдлыя ідэалагічныя заклікі, вестыбюлі цяпер упрыгожваюць мастацкія фотапано, якія распавядаюць аб мінулым Бацькаўшчыны. Нядаўна, выконваючы заказ БТІ, двое маладых мастакоў стварылі серыю арыгінальных партрэтаў выдатных людзей Беларусі.

Для каардынацыі працы па стварэнні і ўнармаванні беларускай навуковай тэрміналогіі ў інстытуце заснаваны свой тэрміналагічны цэнтр. У навучальным працэсе ўжо сёння шырока карыстаюцца некалькімі тэрміналагічнымі руска-беларускімі і беларуска-рускімі слоўнікамі (па дрэваапрацоўцы, па экалогіі і лесазнаўству). Сёлета запланавана выдаць яшчэ сем такіх слоўнікаў і дапаможнікаў, што падрыхтаваны да друку супрацоўнікамі БТІ. Справы, як бачна, ідуць добра. Але актывісты суполкі ТБМ інстытута апошнім часам адчулі вострую неабходнасць палепшыць формы сваёй работы. Так, па фінансавых пытаннях (аплата пазаштатным лектарам на інстытуцкіх моўных курсах, ва універсітэце беларускай мовы, гісторыі і культуры, аплата заказаў па нацыянальным афармленні памяшканняў, рахункі за экскурсіі, выдавецкую дзейнасць і г. д.) кожны раз даводзілася звяртацца за дапамогай у рэктарат, папярэдне ўзгадніўшы ўсё з рознымі службамі ВНУ ці з Міністэрствам адукацыі. Суполка не магла нават самастойна разлічвацца за самыя дробныя паслугі. Натуральна, што гэта не спрыяла актывізацыі далейшай работы суполкі.

Менавіта таму ў сяброў суполкі ТБМ Тэхналагічнага інстытута дзеля больш паспяховага аператыўнага вырашэння статутных задач таварыства і ўзнікла думка павысіць узровень сваёй самастойнасці, надаўшы суполцы статус юрыдычнай асобы. А гэта азначала на практыцы, што трэба адкрыць уласны банкаўскі рахунак, атрымаць дазвол на права карыстання ўласнай пячаткай. Да слова, рэктарат Беларускага тэхналагічнага да гэтага паставіўся вельмі прыхільна. Гэтая ініцыятыва знайшла падтрымку і ў сакратарыяце ТБМ імя Ф. Скарыны, дзе суполка таварыства БТІ нядаўна зарэгістравана ў якасці юрыдычнай асобы.

Наш карэспандэнт.

Не палешукі, а беларусы

Трапіў мне нядаўна ў рукі нумар «Кобрынскага весніка» за 3 сакавіка з артыкулам С. Давыдзюка, А. Мартынава і А. Сушчука «Какой язык «матчын»?» І захацелася мне таксама прыняць удзел у дыскусіі, якая, відавочна, уяўляе цікавасць не толькі для жыхароў Кобрыншчыны. Бяскрыўдная, здаецца, праблема, не ясная да канца не толькі аўтарам, але і спецыялістам-мовазнаўцам,— у якой ступені мясцовую кобрынскую гаворку можна лічыць дыялектам беларускай мовы,— набывае пад ліхімі пёрамі аўтараў аблічча пагрозлівай палітычнай праблемы. І вельмі злавеснай, калі ўлічыць, з якою настойлівасцю і паслядоўнасцю раздзімаюць полымя моўна-палітычных праблем былыя «інтэрнацыяналісты» ў розных кутках былога СССР.

Сапраўды, аб чым гаворка, што турбуе аўтараў згаданага артыкула? Не адразу можна знайсці адказ на гэтае пытанне, бо разважанні С. Давыдзюка і кампаніі заблытаныя не горш, чым заячы след. Але, нарэшце: «Теперь же начался активный процесс интенсивной насильственной белорусизации. Преподавание во всех первых классах ведется на белорусском языке». Во, бачыце, як — інтэнсіўны, актыўны, гвалтоўны! І толькі таму, што выкладанне ў першых класах вядзецца на дзяржаўнай (!) мове. Хацелася б паверыць аўтарам, што «ва ўсіх першых класах», ды цяжка. Сёння наўрад ці ёсць для гэтага дастаткова сіл і магчымасцяў.

«Гвалт», які сёння, на думку аўтараў, робіцца на Кобрыншчыне, параўноўваецца з сітуацыяй, якая існавала ў міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі. Аўтары пішуць: «Западнополесский... язык поляками был обречен на гибель... Польский язык интенсивно внедрялся на Кобринщине при помощи школ, в которых преподавание велось исключительно на государственном языке. И все же местные патриотические силы оказывали сопротивление ассимиляционным устремлениям властей предержащих. В 20—30-ых годах на Кобринщине активно действовало украинское культурно-просветительное общество «Просвіта». В то же время полностью отсутствовали такие белорусские организации, как «Таварыства беларускай мовы» и «Грамада».

У гэтай доўгай цытаце ўсё паказальнае. І тое, што аўтары пішуць, і яшчэ болей тое, пра што яны не згадваюць. Аказваецца, існуе «западнополесский язык», але мясцовыя «патриотические силы» актыўна дзейнічалі праз украінскае таварыства «Просвіта». А беларускія ТБМ і «Грамада» «полностью отсутствовали»... Памыляецеся, спадары! Калі, зразумела, не хлусіце свядома.

Адкрыем выдадзеную ў 1967 годзе кніжку доктара гістарычных навук У. А. Палуяна «Беларуская сялянска-работніцкая грамада» на старонцы 88-ай. Тут, на падставе архіўных дадзеных, прыводзяцца вынікі падлікаў колькасці гурткоў і сяброў «Грамады». Яны існавалі ва ўсіх 7 паветах Палескага ваяводства — Берасцейскім, Кобрынскім, Косаўскім, Лунінецкім, Пінскім, Пружанскім і Столінскім. Праўда, у Кобрынскім і Столінскім паветах прыхільнікаў «Грамады» было няшмат, у лепшым выпадку — дзесяткі чалавек. Але ў суседніх — сотні і тысячы. Больш таго, сярэдняя колькасць гурткоў і прыхільнікаў «Грамады» ў гэтых пяці паветах была толькі крыху ніжэй, чым у сярэднім па ўсёй Заходняй Беларусі. Што, верагодней за ўсё, тлумачыцца проста аддаленасцю палескіх паветаў ад буйных гарадскіх цэнтраў ды хуткаю забаронаю дзейнасці «Грамады» польскім урадам.

Тое ж, што ў заходнепалескім рэгіёне дзейнічала ўкраінскае культурніцкае таварыства, даволі натуральна. Як вядома, гаворкі гэтага рэгіёну ўтвараюць пераходныя дыялекты паміж беларускаю і ўкраінскаю мовамі. І гэта адзначыў не толькі Я. Карскі, але і цалкам не зацікаўленыя нямецкія этнографы.

Аднак ніхто з сур'ёзных даследнікаў ніколі не згадваў пра нейкі «западнополесский язык». І, што цікава, самі аўтары, якія знайшлі гэтую мову, на ёй не пішуць, не звяртаюцца на ёй да чытачоў «Кобрынскага весніка». А выкарыстоўваюць «великий и могучий». У гэтай смешнай недарэчнасці, як кажуць расійцы, і «зарыта собака». Сёння на ўсёй Беларусі агрэсіўна-шавіністычная частка «русскоязычного» насельніцтва патрабуе «двухмоўя». Але не абы-якога, а менавіта расійска-беларускага. Пры гэтым расійская мова як дзяржаўная патрэбна ім зусім не з патрыятычных меркаванняў, бо расійскай мове ў Расіі нішто не пагражае. А выключна з-за таго, што, пражыўшы на Беларусі дзесяткі гадоў, а нехта і ўсё жыццё, яны не далі сабе рады вывучыць беларускую, і яшчэ таму, што, адчуваючы сябе тут на працягу дзесяцігоддзяў гаспадарамі жыцця і ставячыся да мясцовага насельніцтва, як да людзей ніжэйшага гатунку, гэтыя прадстаўнікі русіфікатарскай камуністычнай наменклатуры хапаюцца за саломіну, баючыся страціць глебу пад нагамі, калі нашае нацыянальнае адраджэнне пераможа. Таму і распальваюць нацыянальную варожасць, адмаўляючы відавочнае права беларусаў мець адукацыю на сваёй мове. Таму і выдумляюць штучныя праблемы, накшталт «западнополесского языка», спрабуючы выклікаць напружанасць у грамадстве.

Пэўна ж, расійскамоўным «западнополесским патриотам» можна толькі паспачуваць, бо іхнія пазіцыі вельмі хісткія. За дзесяцігоддзі інтэнсіўнай і агрэсіўнай русіфікацыі ўдалося стварыць толькі пэўны пласт «Иванов, не помнящих родства», але не памяняць мясцовыя гаворкі. У гаворках гэтых можна знайсці беларускія, украінскія, польскія элементы, але не расійскія. І я, адзін з удзельнікаў тых экспедыцый, якія шукалі на Палессі матэрыялы для «Збору помнікаў», сведчу, што не толькі мясцовыя помнікі старажытнага мастацтва ўтвараюць агульнабеларускую стылёвую групу, але і мясцовыя жыхары ніколі не адмаўлялі свайго беларускага грамадзянства. А на нашыя правакацыйныя пытанні, за каго сябе лічаць, за беларусаў ці ўкраінцаў, заўсёды адказвалі: «Ні, мы — беларусы».

І гэтая прыхільнасць мясцовага насельніцтва да Беларусі мае глыбокія гістарычныя карані. Мяжа паміж беларускімі і ўкраінскімі землямі ўсталявалася яшчэ ў 1569 годзе, калі ўкраінскія дэпутаты на Люблінскім сойме прагаласавалі за ўваходжанне ў склад Польскага каралеўства. Тады было праведзена апытанне ў памежных паветах, і ў складзе Вялікага княства Літоўскага засталіся толькі тыя тэрыторыі, дзе насельніцтва прагаласавала за гэта. І з тых часоў яны заўсёды ўваходзілі ў склад беларускіх адміністрацыйных адзінак — і ў Рэчы Паспалітай, і ў Расійскай імперыі. За сто гадоў мяжа ніколі не была і, спадзяёмся, не будзе перашкодаю для культурных і людскіх кантактаў з роднасным насельніцтвам на поўдзень ад яе.

Праблема, якая абмяркоўвалася ў артыкуле, сапраўды існуе. Але выглядае яна зусім не так, як выкладаюць яе спадары Давыдзюк, Мартынаў і Сушчук. Нікому ў галаву не можа прыйсці адмаўляць відавочнае — адметнасць палескіх гаворак. Можна толькі вітаць намаганні тых паэтаў і пісьменнікаў, якія імкнуцца стварыць літаратуру, загрунтаваную не толькі на мясцовых праблемах, але і на мясцовых дыялектах. Можна сабе ўявіць і такое, што гэтая літаратура будзе вывучацца як раздзел беларускай літаратуры ў школах, калі яна дасягне адпаведнага ўзроўню. Тады, зразумела, калі ўсе, а не толькі першыя класы, пяройдуць на беларускую мову навучання.

Аднак пазіцыя аўтараў згаданага артыкула зусім іншая. Ім якраз і не падабаецца беларуская мова. Таму яны і заблытваюць простыя рэчы, параўноўваючы палітыку паланізацыі ў 20—30-ыя гады не з палітыкай русіфікацыі ў 40—80-ыя, а з пераводам сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на беларускую мову. Таму яны то гавораць пра нейкі «западнополесский язык», то ківаюць у бок Украіны, быццам Украіна гаворыць на заходнепалескай мове. Мэта іх відавочная: распаліць міжнацыянальныя спрэчкі на Беларусі, каб з мутнай вадзіцы выплылі на свет Божы інтарэсы трэцяга боку — расійскамоўнай меншасці, якую «крыўдзяць» на перыферыі ўсяго былога СССР. Нашы дабрадзеі, мабыць, крыўдзяцца, што ў гэтым пытанні Беларусь адстае, што ў нас ніхто не страляе, нікога не пазбаўляюць грамадзянства, не праганяюць. І я спадзяюся, што ў нашага народа хопіць цывілізацыі і вытрымкі, каб не паддацца на правакацыю і захаваць згоду. А калі ж гэтыя правакацыі будуць вельмі нахабныя, то сказаць: «Спадары, мы бачым, адкуль тырчаць рогі і хвост ворага чалавечага, супакойцеся!»

Ю. ХАДЫКА,
прафесар, намеснік старшыні БНФ «Адраджэньне»

75 гадоў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі

БНР была рэальнай рэспублікай

У праграму святкавання Дня незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі была ўключана і Навуковая Акадэмія, прысвечаная гэтай гістарычнай падзеі. 19 сакавіка ўвечары ў Доме літаратара сабраліся навукоўцы, аматары гісторыі, журналісты. Як можна было бачыць, невядомая бальшыні нашага народа праўда пра Беларускую Народную Рэспубліку зацікавіла нашых суайчыннікаў. Акадэмію рыхтаваў і вёў Віталь Скалабан.

Найперш прысутныя пачулі запісаны на магнітафонную стужку голас Міхася Ткачова, заўчасна памерлага даследчыка нашай мінуўшчыны. Ён быў у ліку першых, тых, хто пачаў шукаць карані нашай гісторыі, чыя ахвярная праца наблізіла і гэты дзень. Голас Міхася Ткачова прагучаў як запавет яго калегам мужна працягваць ахвярную працу на карысць свайму народу.

«Магутны Божа, уладар сусветаў...»,— усе прысутныя ў зале ўсталі, як толькі пачулі словы гэтага неафіцыйнага беларускага гімна,— «дай плёну ў працы...».

Урачыста пачалася гэтая навуковая імпрэза, урачыста і сціпла. Яе высокі навуковы ўзровень, багацце навуковага досведу, смелыя навуковыя высновы — вартасць і значнасць Акадэміі будзе ўсведамляцца паступова...

З міфічнай птушкай феніксам, бессмяротнай, параўнаў нашу Радзіму Уладзімір Конан. Яго грунтоўны даклад быў прысвечаны духоўнаму і геапалітычнаму сэнсу ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Вучоны адзначыў некалькі драматычных старонак нашай Бацькаўшчыны, распавёў пра розныя спробы рэалізацыі беларускае ідэі незалежнасці супольна з суседзямі. Ды тыя не пажадалі лічыцца з воляй беларусаў. А таму адзіна рэальным шляхам адраджэння стаўся шлях да незалежнасці праз абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Аляксей Каўка, наш суайчыннік, які жыве ў Маскве, падкрэсліў адметнасць беларускага нацыянальнага рэвалюцыйнага руху — не разбуральнага, а стваральнага. Ён успомніў нацыянальных дзеячаў таго часу, якія тады былі падзелены на два лагеры. Сярод «думальнікаў» ён асабліва вылучыў Кастуся Езавітава, Эдварда Будзьку. Але і ў шэрагах тых, да каго спадар Каўка далучае З. Жылуновіча, былі людзі, якіх нельга ацэньваць адназначна. Гэта разумелі і адпаведна ставіліся да іх свядомыя «незалежнікі»: вучоны згадаў верш Янкі Купалы «На смерць Сцяпана Булата».

З вельмі цікавымі дакладамі выступілі маладыя нашы навукоўцы. Іван Саверчанка вызначыў, што нацыянальныя дзеячы зразумелі неабходнасць утварэння незалежнай беларускай дзяржавы, вывучаючы гісторыю свайго народа. «У ідэйнай барацьбе вельмі істотна было сцвердзіць найперш тэзіс пра тое, што беларусы — нашчадкі крывічаў, радзімічаў, драўлянаў — спакон веку, дакуль сягае памяць у глыбіню стагоддзяў, жывуць на вялікіх абшарах вадазбораў Дняпра, Дзвіны, Прыпяці і Нёмана». Такім чынам даводзілася, што гэтая зямля паводле гістарычнага права належыць нашаму народу.

Гісторыкі суседніх дзяржаваў імкнуліся давесці адваротнае. Прыхільнікі беларускага адраджэння стараліся пераканаць свой народ і «ўвесь свет», што беларусы ў старажытныя часы мелі сваю дзяржаву.

Спадар І. Саверчанка згадаў і пра адшуканы У. Ігнатоўскім гістарычны факт існавання ў Полацку XII стагоддзя рэспублікі — першай у Еўропе. «Пасля смерці Усяслава Васількавіча, у 1180 годзе... веча, перакананае ў тым, што другога такога князя немагчыма знайсці, каб не зняважыць нябожчыка, не абрала князя і ўхваліла ў Полацку рэспубліку. Замет князя абралі 30 старшын, каторыя і кіравалі рэспублікай некалькі год».

Настойліва сцвярджалі «незалежнікі» тэзіс, што беларускі народ на працягу сваёй шматвяковай гісторыі стварыў унікальную ў Еўропе культуру, меў дасканалую літаратурную мову, якая была дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, на ёй вялася дыпламатычная перапіска, на ёй створаны выдатныя помнікі пісьменства, літаратуры, філасофіі, юрыспрудэнцыі. Здабыткі багатай беларускай кніжна-пісьмовай культуры апісаны В. Ластоўскім у яго «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі».

Валянцін Мазец звярнуў увагу на праграму культурнага будаўніцтва ў БНР. Дарэчы, яшчэ на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый у сакавіку 1917 года былі вызначаны накірункі культурнай і асветніцкай дзейнасці, дзеля чаго былі створаны адпаведныя камісіі. Урад БНР прызнаў гэтую дзейнасць дзяржаўнай справай.

Станіслаў Рудовіч падрабязна разгледзеў узнікненне і развіццё ідэі незалежнасці: ад патрабавання аўтаноміі ў складзе Расіі да цалкавітай самастойнасці.

Неабходнасць абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі пераканаўча даказаў у сваім выступленні вядомы наш гісторык, правазнаўца Язэп Юхо. Ён прыгадаў абставіны, у якіх апынулася наша Бацькаўшчына напрадвесні 1918 года. Як вядома, значная частка Беларусі тады была акупавана нямецкім войскам. Значная колькасць заходніх паветаў, пераважна сучаснай Гродзенскай вобласці, была ўжо ўключана ў склад Нямеччыны і стала называцца Новай Усходняй Прусіяй. На гэтай тэрыторыі немцы пачалі браць рэкрутаў у сваё войска і рыхтавалі іх, каб паслаць ваяваць на французскі фронт. Перад тымі, каму Усебеларускі Кангрэс даверыў права вырашаць нацыянальныя інтарэсы беларусаў, паўстала праблема абароны юначых жыццяў, якім ужо вызначылі ролю «гарматнага мяса».

Народны Сакратарыят быў вымушаны абвясціць Беларускую Народную Рэспубліку незалежнай дзяржавай, каб не дапусціць падзелу яе тэрыторыі паміж некалькімі дзяржавамі. Амаль у той жа час Савецкая Расія абвясціла аб скасаванні ўсіх дамоваў Расійкай імперыі. Такім чынам, яна адмаўлялася ад правоў на беларускія землі.

Анатоль Грыцкевіч распавёў пра беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны, якія ў той час цалкам залежалі ад палітычнай сітуацыі. У 1915 годзе ў літоўскіх правых колах узнікла ідэя стварэння Вялікага княства Літоўскага з літоўскіх і беларускіх земляў. Неўзабаве тады прадстаўнікамі беларускіх, літоўскіх, польскіх ды яўрэйскіх арганізацый быў апублікаваны Універсал Канфедэрацыі ВКЛ, дзе гаварылася пра неабходнасць канфедэратыўнай дзяржавы. Але ў далейшым абодва бакі пераважна самі стараліся вырашыць свае нацыянальна-дзяржаўныя пытанні. Восенню 1918 года, калі немцы атрымалі ад урада РСФСР вялікую кантрыбуцыю золатам і таварамі ды пачалі выводзіць сваё войска з беларускіх абшараў, Літва і Беларусь адчулі неабходнасць збліжэння. Перад пагрозай бальшавіцкай акупацыі пачаліся перамовы. Тады пры літоўскім урадзе было створана Міністэрства Беларускіх Спраў, беларускім прадстаўнікам адводзілася 25 працэнтаў месцаў у літоўскім Сойме, беларуская тэрыторыя ў Літоўскай дзяржаве павінна была стаць аўтаноміяй з беларускай мовай як афіцыйнай. Міністэрствам Беларускіх Спраў літоўскага ўрада быў прызначаны Вайсковы сакратарыят, што займаўся стварэннем беларускага войска, на якое вельмі разлічваў урад Літвы, бо яго ўласнае войска было нешматлікім. Вынікі Рыжскага замірэння 1920 года і мірнай дамовы 1921 года перапынілі афіцыйныя адносіны паміж урадамі БНР і Літвы, дзе пазней пэўны час жылі толькі некаторыя беларускія дзеячы.

Пра шмат якія невядомыя старонкі гісторыі Беларусі, пра падзеі часу стварэння БНР распавядалі Ю. Туронак (пра трансфармацыю беларускай нацыянальнай ідэі падчас Другой сусветнай вайны), Р. Лобаў (пра консульствы і дыпламатычныя прадстаўніцтвы БНР у Прыбалтыйскіх краінах, у Даніі, Празе, Канстанцінопалі, Берліне).

Таццяна Процька нагадала пра «Берлінскую драму», пра міф аб перадачы мандатаў урада БНР ураду БССР. Цяпер хочуць даказаць, што перадача мандатаў — гэта пераасэнсаванне дзеячамі БНР сваёй дзейнасці, крах ідэі БНР. На самай жа справе Рада БНР тады прыняла рашэнне: калі хто хоча вярнуцца на Бацькаўшчыну, хай найперш напіша заяву пра выхад з Рады, а пра далейшае хай вырашае асабіста.

Ганна Сурмач, дырэктар Цэнтральнага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь, і Язэп Янушкевіч пазнаёмілі прысутных з праблемамі пошукаў архіваў БНР. Але і тое, што ўжо вернута нашай дзяржаве, яе народу, сведчыць: «БНР была рэальнай рэспублікай».

На Акадэміі з просьбы прысутных выступіў Зянон Пазьняк. Ён гаварыў пра палітычную ды эканамічную сітуацыю ў рэспубліцы, якая ўзнікла ў сувязі з плануемым эканамічным саюзам з Расіяй, дзеля чаго Беларусі трэба будзе адмовіцца ад нейтралітэту. А гэта — дзяржаўная здрада.

Здзіслаў СІЦЬКО.

Старыя беларускія гімназіі

ПОМНЯЦЦА ТЫЯ ДАЛЁКІЯ ДНІ

У адным з нумароў часопіса «Спадчына» прачытаў некалькі радкоў пра тое, што ў Будславе ў снежні 1917 года адкрылася беларуская гімназія. У чатырох класах займалася 300 вучняў. Дырэктарам працаваў Язэп Васілевіч з недалёкай адсюль вёскі Пузыры. Настаўніцай беларускай мовы была яго дачка Люба. З дзецьмі займаўся і яго сын (імя, на жаль, невядома). Заснаваны пры гімназіі культурна-асветны гурток «Вяночак» ставіў «Паўлінку», «Па рэвізіі», «Як яны жаніліся». Са спектаклямі гурткоўцы выязджалі ў суседнія мястэчкі Даўгінава і Докшыцы.

З мэтай даведацца, ці застаўся ў Будславе хто-небудзь з былых навучэнцаў гімназіі, я наведаў гэта мястэчка. Цікавай была сустрэча з 85-гадовай Яўгеніяй Данілаўнай Мілеўскай, якая шмат памятае пра тыя далёкія падзеі.

Вучыліся мы з вялікай ахвотай, — кажа жанчына. — Бацькі былі задаволены, што навучанне вялося на роднай мове. Шмат ставілася п'ес, наладжваліся канцэрты, на якіх мы спявалі «Зорку Венеру», «Пагоню» на словы М. Багдановіча, «А хто там ідзе?» на словы Я. Купалы. (Нягледзячы на сталы ўзрост Яўгенія Данілаўна і сёння памятае вершы Багушэвіча, Багдановіча, Купалы, Коласа, якія вучыла ў дзяцінстве). Кожная маці вышывала дзецям кашулі з беларускім арнаментам. Старэйшыя дзяўчынкі рабілі гэта самі

У школе быў бел-чырвона-белы сцяг. Герб «Пагоню» намаляваў настаўнік.

На мітынгах, сходах вучні, у тым ліку і Яўгенія Данілаўна, дэкламавалі патрыятычныя вершы.

Работай гімназіі цікавіўся і чым мог дапамагаў ураджэнец Будслава Эдуард Будзька, адзін з выдаўцоў «Дзянніцы».

Шырока і па-святочнаму адзначалася ў гімназіі свята абвяшчэння незалежнасці Беларусі (25 сакавіка 1918 года). Дырэктар школы зрабіў даклад, настаўніцы Папковіч, Ігнатава падрыхтавалі канцэрт. Зала была перапоўнена бацькамі гімназістаў, жыхарамі навакольных вёсак.

Падручнікі, дапаможнікі для гімназіі прывозілі з Вільні, Гродна. Апрача гімназіі, у тыя гады ў Будславе існавалі бібліятэка, клуб з вялікай глядзельнай залай (пакінутай штабам рускай арміі), хор, струнны аркестр.

Усё змянілася пасля Рыжскага дагавора паміж Расіяй і Польшчай. З Вільні прыехаў інспектар Венсаловіч і закрыў беларускую гімназію. Замест яе пачала працаваць польская школа.

Многія былыя гімназісты падаліся на вучобу ў Вільню, у гімназію імя Ф. Багушэвіча, — такая вялікая была цяга вучыцца на роднай мове. Ураджэнцы Будслава Вінцук Грышкевіч, Часлаў Ханяўка з Вільні паехалі ў Чэхаславакію ва універсітэт. Атрымаўшы дыпломы, вярнуліся ў Вільню і працавалі настаўнікамі гімназіі, не здрадзіўшы беларускасці.

Сёння ў Будславе працуе сярэдняя школа. Стаўшы ў 1939 годзе беларускай, школа такой засталася, хаця нялёгка было, бо такія школы раёна ў пасёлках Мядзел, Крывічы, Свір не мелі гады 2—3 таму назад ніводнага класа з беларускай мовай навучання.

Спрыяла беларускасці ў Будславе і наша зямлячка Паўліна Мядзёлка, якая ў пасляваенныя гады працавала ў мясцовай школе.

М. ЧАРНЯЎСКІ.

НА ЗДЫМКУ: Яўгенія Данілаўна Мілеўская.

Кароткая энцыклапедыя беларускай мовы

Аўтарскі стыль. Кожны сапраўдны пісьменнік па-свойму бачыць і ўспрымае навакольны свет і адлюстроўвае яго з дапамогай сваіх, адметных спосабаў і прыёмаў пісьма.

Б — другая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай літары, якая называлася «букі». Тая ў сваю чаргу ўзнікла на аснове грэка-візантыйскай устаўной В (вітаў). Абазначала зычныя гукі [б], [б'], не мела лічбавага значэння, бо лічбавае значэнне два перайшло на кірыліцкую літару В. У рукапісах XV—XVII стагоддзяў у сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (устаў, паўустаў, скорапіс) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія памагаюць вызначыць час і месца напісання літаратурных помнікаў. Пачынаючы з друкаваных форм Францішка Скарыны, стала ўжывацца малая і вялікая.

Паводле А. М. БУЛЫКІ.

ФАНЕТЫЧНАЯ РАЗМІНКА

1. Прачытайце словы, правільна вымаўляючы зацвярдзелы гук ч

лясо́чак шчо́дры кро́чыць
дубо́чак шчы́ры ба́чыць
грыбо́чкі шчу́плы сачы́ць
пянёчкі шту́чны мачы́ць

2. Звяртаючы ўвагу на вымаўленне зычных ды іх спалучэнняў, прачытайце ўрыўкі з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля».

* * *

Я помню летнія часіны
І вас, грыбныя баравіны!
Ранюткі час. Нідзе нікога,
Між дрэў звіваецца дарога,
А па дарозе ты з кашом
У лес шыбуеш ціхачом...

* * *

Шнуруюць бабы і дзяўчаты
І кантралююць мох узняты
І тыя кучачкі калюшак,
Дзе грыб схаваў свой капялюшык.
Другая нізенька прыгнецца,
Не ходзіць — поўзае вакол,
Рукою мацаючы дол,
Як бы на клад найшла, здаецца,
І так старанненька шукае:
І пад ядлоўчык заглядае,
Пад верасок і пад хваінку,
Разгорне кожную гарбінку
І моху купінку ўздзярэ —
Ну, ўсё, як ёсць, перабярэ.

ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА

1. Прачытайце тэкст. Растлумачце асаблівасці вымаўлення выдзеленых слоў. Дайце загаловак тэксту.

У хуткім *часе*, як сыдзе апошні *снег*, аматары ціхага *паляванне* адкрываюць новы сезон. *Прайдзіце* па лясной *сцяжынцы*, зірніце навокал. Калі на асінах з'явіліся «завушніцы», а *бярозавыя* пупышкі наліліся *чырванню, значыць*, можна *смела адпраўляцца* на пошукі смаржкоў і *страчкоў*.

УРОК ЧАТЫРНАЦЦАТЫ

Вайскоўцам пра родную мову

Растуць яны на *схілах* яроў, на *прыгрэтых* сонцам лясных палянах і *дзялянках* — лесасеках. Але часцей за ўсё можна сустрэць смаржкі і страчкі на старых га́рах.

Страчкі — нізкія, з *цёмнымі*, быццам бы *пакамечанымі шапачкамі*, смаржкі — стройныя, з вастраносым верхам, *чымсьці нагадваюць* мініяцюрныя кіпарысы. *Грыбы* маюць прыемны пах.

Перад ужываннем смаржкі *рэкамендуюць гатаваць* мінут 10 — 15 ды старанна *прамыць* у халоднай вадзе, а *пасля ўжо* смажыць або рыхтаваць іншую страву. Страчкі ўсё ж лепей *сушыць*.

А калі *прайсці ўзбоч* лесу, то, несумненна, можна натра́піць на белыя *тугія* шарыкі порхавак. Гэтыя *надзвычай* спажыўныя і *смачныя* грыбы пакуль што не карыстаюцца той папулярнасцю, якую *заслугоўваюць*. Іх можна *выкарыстоўваць* і для *прыгатавання* першых страў, і смажыць, і нават марынаваць. *Збіраць* трэба толькі маладыя грыбы.

З календара «Родны край» за 1991 г.

2. Прачытайце выразна верш П. Броўкі. Выпішыце словы, напісанне якіх не адпавядае вымаўленню.

Дзень добры...

Няхай сабе здаецца, можа,—
Як прыязджаў дамоў не раз.
— Дзень добры!.. — я шаптаў бярозам,
— Дзень добры!.. — чулася ў адказ.

І сэрца білася так гулка,
Нібы даўно ў юначы час.
— Дзень добры!.. — віншаваў рачулку.
— Дзень добры!.. — чулася ў адказ.

Я йшоў туды, дзе мог напіцца,
Каб смагі жар сышоў, пагас...
— Дзень добры!.. — я казаў крыніцы,
— Дзень добры!.. — чулася ў адказ.

Удзячнасці шукаў я словы,
Казаў іх шчыра, без прыкрас...
— Дзень добры вам, гаі, дубровы!
— Дзень добры!.. — чулася ў адказ.

3. Прачытайце сказы, запомніце. Выкарыстайце іх у сваіх паведамленнях.

* Сем мільёнаў гектараў тэрыторыі Беларусі занята лясамі.

* Калісь лясы раслі скрозь, на ўсім абшары нашай краіны, акрамя паплавоў каля рэк ды балотаў.

* Як прыемна адпачыць у лесе!

* Шмат што можа расказаць палясоўшчык (ляснік).

* У лясах Беларусі расце дваццаць восем парод дрэў і каля сямідзесяці відаў кустоў і кусцікаў.

* Нашы лясы багатыя на грыбы і ягады.

* У нашых лясах растуць баравікі, бабкі, чырвонагаловікі, сыраежкі, лісічкі, ваўнянкі, зялёнкі ды іншыя, усяго больш за семдзесят відаў ядомых грыбоў.

* Надыдзе лета, і пойдуць людзі ў грыбы, ягады.

4. **Заданне.** Скажыце, ці не здаецца Вам, што жыццё ў лесе адбілася на характары беларусаў?

Магчыма, зрабіць нейкія высновы Вам дапаможа надрукаваная ніжэй нататка пра жрацоў кельцкіх плямёнаў, якіх называлі друідамі.

Друіды

У IV стагоддзі да нараджэння Хрыста кельцкія плямёны прыйшлі на тэрыторыю сучаснай Чэхіі ды ў Карпаты, дзе і цяпер жывуць бойкі,— верагодна, нашчадкі кельцкага племя боеў. Мяркуюць, што кельты трапілі і ў Панямонне, дзе ў Наваградскім раёне ёсць вёска Бойкі. У кельтаў былі жрацы — друіды, якія, апроч рэлігійных абрадаў, выконвалі функцыі суддзяў і лекараў, не цураліся палітычнай дзейнасці і нават узначальвалі барацьбу з рымскімі захопнікамі. Каб заслужыць права ўвайсці ў вышэйшую касту, друіды павінны былі на працягу 20 гадоў жыць сярод дзікай прыроды, займаючыся таемнымі навукамі, медытацыяй, спасцігаючы таямніцы і законы прыроды. З асаблівай пашанай яны адносіліся да дрэваў, а чалавека лічылі часткай прыроды, такой жа, як і дрэвы.

Зразумела, за столькі гадоў назірання жыцця лесу можна было заўважыць пэўныя асаблівасці дрэў, характэрныя і для чалавека. Паводле ўяўлення друідаў, кожны чалавек мае свайго адпаведніка ў пэўнай пародзе дрэў.

І беларусы, відаць, не выпадкова маюць прозвішчы, што паходзяць ад слоў дуб, граб, ясень, арэх, бук, вяз ды іншых назваў дрэў.

5. Прачытайце і спішыце тэкст, растлумачце асаблівасці вымаўлення і напісання выдзеленых слоў. Паводле пачатку складзіце апавяданне.

НА АДПАЧЫНКУ

Сонца пачало ўжо *спадаць* на захад, але было *яшчэ* вельмі *спякотна*. Спякота гэта асабліва *адчувалася* ў сасонніку, які *патыхаў гарачым*, млосным настоем смалы, *нагрэтаю* травою і суніцамі. Паветра *ў* ельніку здавалася зусім *нерухомым*.

Салдаты сабраліся перакусіць. Яны развязалі рэчавыя *мяшкі*, узялі адтуль хлеб, кансервы.

І тут Мікола заўважыў, што...

Паводле І. Мележа.

6. Складзіце паведамленні паводле наступных тэмаў.

* Лес — багацце Беларусі.
* Пачалася грыбная пара.
* Я ведаю грыбныя мясціны.
* Нам у грыбах пашанцавала.
* У нашым лесе растуць розныя ягады.
* У ягады мы збіраемся раніцай.
* На ўзлеску зацвілі пралескі.
* Ваш букет вельмі прыгожы, але хай бы цвілі краскі ў лузе.

Тлумачэнне новай тэмы: Назоўнік. Род, лік назоўнікаў

Назоўнік (имя существительное) — часціна мовы, якая абазначае прадмет і адказвае на пытанні х т о? ш т о?. Напрыклад, *конь, горад, газета, неба, зброя, рота, чалавек*.

Як і ў расійскай, у беларускай мове назоўнікі бываюць **мужчынскага** *(стол, дом, чалавек)*, **жаночага** *(рака, дарога, дзяўчына)* і **ніякага** *(поле, дрэва, здароўе)* роду.

Даволі часта род назоўнікаў у расійскай і беларускай мовах супадае, напрыклад: *дарога* (ж.р.), *лес* (м.р.), *возера* (н. р.).

Аднак ёсць выпадкі, калі адны і тыя ж назоўнікі ў беларускай і расійскай мовах маюць розны род.

Прачытайце і запомніце прапанаваныя прыклады.

вялікі **боль** (м. р.)
балючы **мазоль** (м.р.)
залаты **медаль** (м.р.)
высокі **насып** (м.р.)
горкі **палын** (м. р.)
густы **пыл** (м.р.)
прыгожы **роспіс** (м.р.)
злы **сабака** (м.р.)

шырокі **стэп** (м.р.)
бацькаў **шынель** (м.р.)
спелы **яблык** (м.р.)
доўгі **цень** (м.р.)
белая **гусь** (ж.р.)
свежая **салата** (ж.р.)
зялёная **таполя** (ж.р.)
маладая **жырафа** (ж.р.)

Назоўнікі змяняюцца па ліках (числах). Яны маюць **адзіночны лік** *(дуб, бяроза)* і **множны** *(дубы, бярозы)*.

Некаторыя назоўнікі ўжываюцца толькі ў **адзіночным** *(золата, святло, надвор'е)* або толькі ў **множным** *(сані, шахматы, акуляры)* ліку.

Назоўнікі *грудзі, дзверы, крупы, канопліі* ў беларускай мове ўжываюцца толькі ў форме **множнага** ліку (расійск. *грудь, дверь, крупа, конопля*), а назоўнікі *бяліла, чарніла* толькі ў форме **адзіночнага** ліку (расійск. эти *белила*, синие *чернила*).

АСНОВЫ НАЗОЎНІКАЎ

Усе назоўнікі падзяляюцца на групы з асновай:

на цвёрды зычны: *дом, краіна, акно;*
на мяккі зычны: *песня, поле, гай;*
на зацвярдзелы зычны: *звер, пушча, мора;*
на г, к, х: *кніга, рука, гарох.*

Запомнім. Назоўнікі аднаго і таго ж роду ў адным і тым жа склоне ў залежнасці ад асновы могуць мець розныя канчаткі, напрыклад:

краіна — па краіне
песня — па песні
пушча — па пушчы
рука — па руцэ

ЗАМАЦАВАННЕ

1. Прачытайце тэкст паводле М. Лобана і растлумачце, што такое **неруш**. Пералічыце назоўнікі і вызначце іх род.

Неруш

Пасля першага жніва Ніна з Алесем наведаліся ў пушчу назбіраць грыбоў. Спачатку грыбы трапляліся рэдка. Ніна пераходзіла з адной баравіны на другую. Але вось Алесік узбіўся на грыбовішча, якое называецца неруш. З радасці ён справіў такі піск, і Ніна падумала, што яго гадзюка ўкусіла. Яна хутчэй кінулася ратаваць. Аж убачыла, што Алесік стаіць на адным месцы і тыкае пальцам вакол сябе. Грыбоў было так многа і яны так прыгожа сядзелі, што шкада было іх рэзаць. Яна ніколі ў жыцці не мела такога грыбнога шчасця. Каб гэта столькі баравікоў! Іх была тут не адна сотня па ўсёй лугавіне. Алесь насіў, ссыпаў каля кошыка і зноў бег. А пад ігліцай заўважалі ўсё новыя і новыя грыбы. Калі сабралі, то тры кашы былі поўныя пад самыя дужкі.

2. Спішыце тэкст, падкрэсліце назоўнікі і вызначце ў іх аснову.

Усю ноч не спыняўся гул на зарэчнай шашы. Ішлі бясконцыя калоны машын, грукатала артылерыя, цягнуліся конныя абозы. Лес часам расступаўся, і шаша выныра́ла на чыстае поле. Салдаты адразу насцярожваліся, ямчэй сціскалі ў руках вінтоўкі, аўтаматы. Даволі часта то справа, то злева ўзляталі белыя ракеты і паволі згасалі, разліваючы трапяткое, нежывое святло. У першыя ночы ракеты палохалі, цяпер да іх прызвычаіліся. Зрэдку даносіўся прыглушаны гул матораў, надрыўны, з задышкай. Гэта неслі свой груз самалёты.

Паводле М. Лынькова.

Узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё мовы

Свойскія жывёлы, птушкі

І. кот — кот
кошка — кошка
котёнок — кацяня, кацянё
собака — сабака (м. р.)
щенок — шчаня, шчанё
лошадь — конь
жеребёнок — жарабя, жарабё
корова — карова
телёнок — цяля, цялё
ІІ. курица — курыца
петух — певень
цыплёнок — кураня, куранё
гусь — гусь (ж.р.)
гусак — гусак
гусёнок — гусяня, гусянё
индюк — індык
индейка — індычка
индюшонок — індычаня, індычанё.

* * *

корм — корм
подножный корм — паша
кормёжка — кармленне
кормёжка лошадей в дороге — папас
сено — сена
сеновал (сарай) — адрына
сенокос — касьба, касавіца
сенокос (место косьбы) — сенажаць.

Заданні. 1. Прачытайце словы, выпішыце тыя, з якімі Вы сустрэліся ўпершыню, і складзіце з імі сказы.

2. Прачытайце і запомніце загадкі, загадайце іх сваім знаёмым.

* Пасярод двара стаіць капа, спераду вілы, ззаду мятла
(Карова.)

* Дзве галавы, дзве спіны, шэсць ног, адзін хвост. (Чалавек на кані.)

* Чатыры дзяды назад бародамі. (Конскія капыты.)

Гартаючы старонкі «Беларуса»

Беларусы, якія волю лёсу апынуліся ў чужых краінах, вядуць актыўнае грамадскае жыццё, выдаюць кнігі, газеты, часопісы маюць свае цэрквы і касцёлы. У ЗША, Канадзе, Аўстраліі і Англіі створаны культурныя цэнтры, дзе адзначаюцца рэлігійныя святы, праводзяцца грамадскія ўрачыстасці і сустрэчы. Часта пры такіх цэнтрах ёсць бібліятэкі, музеі, працуюць школкі, у якіх дзяцей вучаць роднай мове. Падрабязная інфармацыя пра грамадска-культурнае жыццё беларусаў у вольным свеце рэгулярна змяшчаецца на старонках газеты «Беларус», што выдаецца Беларуска-амерыканскім Задзіночаннем у ЗША. Сёння мы пазнаёмім нашых чытачоў з найбольш значнымі падзеямі з жыцця нашых суродзічаў.

У кастрычніку мінулага года Беларуская праваслаўная парафія ў Саўт-Рыверы ў штаце Нью-Джэрсі ўрачыста адсвяткавала дваццатыя ўгодкі ўваходу ў царкву імя святой Ефрасінні Полацкай, што была пабудавана на ўласныя сродкі беларусаў.

У горадзе Сіэтл у штаце Вашынгтон адбылася 37-ая канферэнцыя Міжнароднага таварыства этнамузыколагаў, на якой з дакладам на тэму: «Цытаты для кенгуру шматтэкставасць і стыль у беларускім року» выступіла Марыя Паўла Сурвіла, доктар Мічыганскага універсітэта. Яна даследуе розныя падыходы да музычнага стылю ў музыцы беларускіх гуртоў з асаблівым акцэнтам на гурт «Мроя».

Беларусы Нью-Йорка і навакольных мясцін наладзілі святкаванне «Дажынак» у Гайленд Парку. Былі тут і госці з Беларусі. З прывітальным словам выступіў сп. В. Русак, які нагадаў пра дваццатую сустрэчу беларусаў Паўночнай Амерыкі і адзначыў асаблівыя заслугі ў яе правядзенні сп. Антона Шукелойця, старшыні галоўнай управы БАЗА, сп. Міколы Ганько, старшыні Згуртавання Беларусаў Канады, сп. Янкі Азаркі, старшыні ньюджэрсійскага аддзела БАЗА і сп. Юркі Азаркі, старшыні сустрэчы. Ён расказаў таксама пра канкрэтныя вынікі работы Фонда дапамогі ахвярам Чарнобыля, які быў заснаваны на пасяджэнні Рады Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ) у красавіку 1989 г. Сёння Фондам на Беларусь адпраўлены чатыры кантэйнеры з медыкаментамі коштам больш за два мільёны рублёў.

28 і 29 лістапада беларусамі Амерыкі, Канады, Англіі і Аўстраліі адзначаліся ўгодкі Слуцкага паўстання.

З гэтай нагоды прадстаўнікі Задзіночання Беларуска-амерыканскіх ветэранаў (ЗБАВ) усклалі вянок да помніка беларускім героям на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку. На ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным гэтай даце, з дакладам «Пайшлі памяраць, каб жыла Бацькаўшчына» выступіў д-р Янка Запруднік. Ён адзначыў важнасць для псіхалагічнага адраджэння беларусаў факта адкрытага ўшанавання памяці слуцкіх паўстанцаў на Бацькаўшчыне. Былі зачытаны прывітанні ад рэдактара ветэранскага часопіса «Зважай» сп. Кастуся Акулы, а таксама тэкст, высланы ад БАЗы Згуртаванню беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ) з гэтай нагоды таксама правяло ўрачыстае пасяджэнне ў зале Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны. З рэфератам на тэму дня выступіў А. Зданковіч. Ён зачытаў прывітальныя лісты ад беларускіх згуртаванняў з розных куткоў свету. Тут жа з прамовай выступілі айцец А. Надсан, прафесар Дж. Дзінглі, які адначасна паведаміў сумную вестку пра смерць выдатнага вучонага і грамадскага дзеяча Міхася Ткачова, памяць якога была ўшанавана хвілінай маўчання.

Беларусы Аўстраліі таксама адзначылі дзве важныя гістарычныя падзеі: 75-ыя ўгодкі Усебеларускага Кангрэса і 72-ія ўгодкі Слуцкага паўстання. З гэтай нагоды адбылося ўрачыстае пасяджэнне ў Беларускім клубе ў г. Сіднеі, у час якога з дакладам выступіў Міхась Лужынскі.

Управа Беларускага Аб'яднання ў Заходняй Аўстраліі таксама арганізавала святкаванне ўгодкаў Слуцкага паўстання.

Пасля набажэнства, якое адбылося ў царкве св. Марыі ў Беларускім Народным Доме (г. Байсвотэр), прысутных вітаў старшыня БАЎЗА Міхась Раецкі. У сваім дакладзе ён спыніўся на прычынах Слуцкага паўстання і расказаў пра лёс змагароў Слуцкай брыгады. У Адэлайдзе (Аўстралія) беларусы, украінцы і харваты пабудавалі дом для састарэлых людзей. На гэтую справу дзяржава ахвяравала 1,7 мільёна долараў.

У г. Мельбурне (штат Вікторыя) адбыўся 10—21 студзеня г. г. Дзесяты з'езд Выканаўчага камітэта Федэральнай Рады Беларускіх арганізацый у Аўстраліі. Удзельнікі з'езда прааналізавалі сваю дзейнасць за апошнія два гады. У сваім дакладзе старшыня Выканаўчага камітэта сп. А. Груша адзначыў важнасць дапамогі ахвярам чарнобыльскай катастрофы ў Беларусі. З гэтай мэтай было сабрана 37 тысяч долараў, і адказная праца па зборы сродкаў на дапамогу чарнобыльцам праводзіцца далей. З'езд выбраў на наступныя два гады кіраўніцтва Федэральнай Рады.

Прадстаўнікі беларускай дыяспары вядуць актыўнае грамадскае жыццё, змагаюцца за незалежную Беларусь. На вялікі жаль, гэта ўжо людзі сталага ўзросту, і з кожным годам іх становіцца ўсё меней. Нядаўна нашы суродзічы ў Амерыцы смуткавалі з нагоды смерці аднаго са сваіх найбольш актыўных працаўнікоў, шматгадовага кіраўніка Задзіночання Беларуска-амерыканскіх ветэранаў Сяргея Тутырчыка. 14 снежня пасля доўгай і цяжкай хваробы памерла маці вядомага беларускага дзеяча, дырэктара Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва ў Нью-Йорку Вітаўта Кіпеля Марыя Кіпель. Яна належала да таго пакалення беларусаў, якое ў 30-ых гадах за сваю беларускасць і любоў да Бацькаўшчыны стала ахвярай сталінскага тэрору і генацыду на Беларусі. Беларусы Аўстраліі смуткуюць з нагоды смерці свайго нястомнага змагара за незалежную Беларусь, грамадскага дзеяча Міколы Скабея. Не стала таксама Янкі Сяўковіча і Зыгмунта Стантона (Сянкевіча), што жылі і вялі актыўную грамадскую дзейнасць у Вялікабрытаніі.

У адным з нумароў «Беларуса» пададзена інфармацыя пра вялікі артыкул вядомай брытанскай журналісткі Веры Рыч «Хто прыйдзе першы, той і будзе мець» пра рэлігійны стан на Беларусі і дыскрымінацыю беларускай мовы каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі і праўніяцкую царкву, што прыхільна ставіцца да беларускай мовы. Аўтар прыводзіць новыя неафіцыйныя статыстычныя звесткі аб веравызнаннях у сучаснай Беларусі.

Гарадская ўправа каліфарнійскага горада Торэнса выказала падзяку рэдактару англамоўнага часопіса «Беларускі агляд» Язэпу Арцюху за яго грамадскую дзейнасць, працавітасць і адданасць справе.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.

Уражанні

КРЫНІЦЫ

Сцяжынка ў яр. Круты пагорак. Спуск. А там у лазняку — крыніца. Звычайнае відовішча. Але як усё даступна, проста: прыпаў ніцма да шаўковай муравы, убачыў у вадзяным люстэрку свой твар, напіўся ўволю прахалоднай гаючай вадзіцы. І, удзячны невядома каму, рушыў далей... Але — стоп. Пачакай крыху, добры чалавек. Затрымайся ля гасціннай крынічкі, прысядзь і спытай сябе: «Адкуль усё гэта хараство? Каму асабіста ты павінен быць удзячны? Хто канкрэтна выратаваў цябе ад стомы, смагі і нязноснай спякоты?» Задумайся, прыслухайся да звонкага цурчання серабрыстага ручайка. Прыгледзься да таго, як на самым дне крынічкі злёгку ўзлятаюць, павольна апускаюцца і ледзь прыкметна варушацца, нібы жывыя, маленькія пясчынкі, каменьчыкі, дробныя кавалачкі драўніны. Пасядзі, палюбуйся нястомнай працай маленькага беларускага гейзера з яго руплівым ручайком. І... не, гэта табе не здалося... вось ён — Цуд... Вось яно — Дзіва!

Далей — яшчэ больш: у ціхім шэлесце дрэў, шэпце травы ты неўзабаве абавязкова пачуеш голас.

Не бянтэжся, то голас жывой Крыніцы. Пасядзі, паразважай, чалавек. І тады ты зноў пачуеш мілагучнае: «І табе я ўдзячна, што жыву!» — прызнаецца Крыніца і зычліва дадасць: — Прыходзь яшчэ. Пачастую цябе чыстай вадзіцай».

Шмат крыніц за жыццё выпадае сустрэць чалавеку. Калі ўспомніць пра кожную з іх, то не цяжка заўважыць, як звязана існаванне крыніц з жыццём людзей.

Зрэшты, мяркуйце самі: адвеку чалавек імкнуўся сяліцца там, дзе была вада. Чалавек красамоўна назваў рэкі «воднымі артэрыямі», свае родныя мясціны «краем блакітных азёраў». Але ён мала задумваўся над тым, што менавіта з маленькага, кволага ручайка пачынаюцца, набіраюць моц магутныя рэкі, што на незлічоных падводных гейзерах якраз і трымаюцца амаль усе малыя і вялікія азёры. Калі ўважліва прасачыць за тым, як уладжаны свет, то не цяжка прыйсці да высновы: усё жывое на зямлі бярэ пачатак з жыватворных крыніц. Шкада, што не кажуць пра іх ні гугу. Хоць без крыніц, без балот і рэк, без лясоў і лугоў, сенажацяў тут была б пустыня. Дарэчы, якраз так і здарылася ў некалі маляўнічых, незвычайных па прыгажосці мясцінах майго дзяцінства.

Першае знаёмства з Крыніцай у мяне адбылося ў вёсцы. Зразумела, шмат гадоў прайшло з таго часу. Але і сёння добра помніцца невялічкая нізіна ля ракі Ушы на Чэрвеньшчыне. Помніцца вільготнае, не зважаючы на ліпеч, паветра і буйныя духмяныя сакаўныя травы, сярод якіх сям-там узвышаецца разлапісты балотны цыбульнік. За дрыгвой — кусцістыя алешыны, непралазны хмызняк. Мы — хлапчукі. Усё нас, дасціпных, надта цікавіць. Босыя ногі спрытна і лоўка пералятаюць з купіны на купіну. Багна вакол злосна бульбоча, бурболіць, свішча, вохкае. Зямля разам з травой пачынае ўсё больш дыхаць, гойдацца, прасядаць. Ад халоднай гаці — па целу мурашы, дрыжыкі. Асаблівага жаху надае тое, што нядаўна ў багну ўвалілася карова, якую ледзь выцягнулі. Непрыемныя ўспаміны. Да таго ж прыгадваецца, як нас некалі пужалі яшчэ і балотнымі чарцямі. Праўда, апошнія, казалі, больш уначы арудуюць, а тут — дзень. І калі чэрці, зрэшты, — бабулькіны байкі, то ўспаміны пра чорных бліскучых вужоў і шэрых гадзюк, якіх на свае вочы кожны неаднойчы бачыў, ужо не казкі... Але, нічога, Уперад!

Вось менавіта такой — недатыкальнай і далікатнай — засталася ў маіх успамінах першая ў жыцці Крыніца. Так і стаіць яна перад вачыма ў сваёй раскошнай зялёнай шалі з увішным віхлявым роем над ёй рознакаляровых стракоз. Тады яна ўяўлялася жывой, поўнай загадкавай, нават небяспечнай чароўнай сілы таямнічай істотай.

Эх!.. Што і казаць, калі цяпер, на жаль, ад той цудоўнай, маляўнічай, мілай сэрцу роднай мясціны не засталося амаль нічога. Сумна, бо тое гожае месца не пазнаць. І што ж мы маем? Дрыгва правалілася, зямля скамянела, травы пасохлі. Пышныя некалі купіны, падобныя да мяккіх падушак, прыкметна ўсохліся, ператварыўшыся ў збітыя з глею, жорсткія валуны. Ні трэляў салаўя, ні траў, ні лесу. Вёска — як сярод пустога стэпу азіяцкі аул. Адно, што толькі суслікаў ды іх свісту не хапае. Што да Крыніцы, то і яна знікла.

Словам, пакутлівы лёс быў у маёй першай Крыніцы, пакуль з зямлі людзі прагна высмоктвалі апошнія сокі... Хацелі больш збожжа, а ледзь не дачакаліся суслікаў. Такі вынік, і такая плата за нядбайнасць...

Не менш жахлівы лёс напаткаў і другую, калі можна так мовіць, маю Крыніцу. У адрозненне ад першай, мала каму вядомай вясковай Крыніцы, другая паводле прапіскі — сталічная. Калі першая Крыніца скончыла жыццё даволі даўно і неяк ціха, гаротна, то сталічная сканала літаральна ўчора, на вачах у двухмільённага горада. Здарылася гэта падзея ў прыгарадзе вёскі Вяснянка, што ў Драздах.

Жыла Крыніца. Струменілася з-пад зямлі ля голага касагора. На выгляд была яна не надта прыгожай, але ж з чыстай вадой. Да той крыніцы прыходзілі не толькі мясцовыя жыхары і гараджане, але і людзі, што прыязджалі на адпачынак з далёкіх краёў. Яшчэ пазалетась у спякотныя дні да яе часта ішлі рыбакі і ўсе тыя, хто адпачываў у Драздах. Але мінулым летам Крыніцы ўжо не было. «І сапраўды, — дзівіліся людзі, — як скрозь зямлю правалілася»... Была свежая вадзіца і — няма. Толькі рыбакі ведалі, каго за гэта злачынства трэба асабіста праклінаць. І клялі... Справа ў тым, што паблізу Крынічкі нейкі будаўнічы ці меліяратыўны трэст вёў земляныя работы. Калі ў глыбіні будаўнікі рабілі двухметровага дыяметра бетонны калектар, Крыніца са сваім бясконцым патокам грунтовых вод ім замінала. Каб пазбавіцца ад плывуноў, вырашылі неўтаймаваны струмень узяць у сталёвую трубу. Такім чынам вышэйшай якасці пітная вада раптоўна апынулася ў палоне, пацякла ў брудны паток гарадской каналізацыі. Як бачым, усё атрымалася лёгка і проста... І няма чаму вельмі дзівіцца. А як жа можа быць там, дзе няма сапраўднага Гаспадара?..

— Да такога ідыятызму ў былыя часы не дадумаўся б нават самы дурны пан, — з абурэннем заўважыў адзін з рыбакоў.

— Ого! — падхапіў другі. — Той бы яшчэ ля Крыніцы загадаў бы паставіць крыж. Наказаў бы абавязкова павесіць на яго саматканы рушнік.

— Мы п'ём ваду з хлорам, — дадаў трэці рыбак, — а тут... Гэта ж такая знявага да людзей... да прыроды!..

Калі гаворка павялася аб драздоўскай крыніцы, то галасы рыбакоў памякчэлі. Знаходзіцца яна пры самай шашы. Лёс гэтай Крыніцы пакуль што шчаслівы. Нібыта пачуўшы галасы тых рыбакоў, да Крыніцы прыйшлі вернікі, паставілі побач моцны крыж, на якім — абразок. Цяпер тое месца — святое. Піце сабе на здароўе, людзі!..

І калі падыходзіш да гэтай Крыніцы, то нельга ўтрымацца, каб ад душы не падзякаваць тым добрым людзям.

Лёс грох Крыніц. А колькі іх на зямлі Беларусі...

Яўген ШПАК.

г. Менск

Рубрыку вядзе

Лявон **БАРШЧЭЎСКІ**

Юхан Людвіг Рунеберг (1804—1877) пісаў свае творы на шведскай мове, але быў гарачым патрыётам Фінляндыі, і сёння яго справядліва лічаць пачынальнікам фінскай прафесійнай літаратуры.

Юхан Людвіг Рунеберг

Паво

(Урывак з паэмы «Паво з Сарыярві»)

Блізка горнай рэчкі Сарыярві
Жыў сабе ды гаспадарыў Паво.
Меў ён жонку і дзяцей з асьміну,
Разам з імі і гараў, і сеяў,
А пасля еў хлеб запрацаваны.
Толькі ж раз вясной дажджы як люнуць,
Скрозь руччы, узяўся снег вадою —
І палову руні з поля змыла;
Ўлетку каласы пабіла градам,
Рэшту — ўвосень маразы згубілі.
Аж галосіць гаспадыня Паво:
«Прыйдзецца нам з торбай пацягацца,
Пад ваконнем сораму набрацца,
Памірaці або жабраваці».
І тады прамовіў жонцы Паво:
«Памяшай муку з карой таўчонай;
Загару глыбей я нашу ніву, —
Перабудзем так да ўраджаю».
І яна муку з карой змяшала,
Загараў глыбей сваю ён ніву,
Пакупіў сямян, прадаўшы оўцы.
Вось растануў снег вясной на полі,
Але руні болей не пашкодзіў.
Ўлетку бура з градам праняслася,
Але не пабіла збожжа Паво.
Маразы ізноў былі пад восень,
Толькі ж ніва Паво ўжо наспела.
І сказала, жыта зжаўшы, жонка:
«Вось калі мы пажывём выгодна.
Годзе нам мяшаць муку з карою, —
Можна чыстага пад'есці хлеба».
І тады прамовіў жонцы Паво:
«Зноў змяшай муку з карой таўчонай,
Бо памерзла ніва у суседа».

Пераклад
Максіма БАГДАНОВІЧА.

Падабенства

Дык колькі хваляў у затоцы
І колькі ў маім сэрцы думак? —
Знікаюць нібы — й застаюцца,
Памерлі нібы — й зноў паўсталі:
Так непадобна ўсё — й падобна —
Усё вяртаецца нанова:
На тым жа моры той жа вецер
Іх уздымае,
Ў грудзях тых самых тая ж любасць
Іх спараджае.

Пераклад са шведскай
Лявона БАРШЧЭЎСКАГА.

Светлай памяці Ларысы Геніюш

7 красавіка споўнілася 10 гадоў з дня смерці нашай вялікай паэтэсы і маёй лепшай сяброўкі з чорных гадоў няволі — Ларысы ГЕНІЮШ. Яе светлай памяці і быў мной сёння напісаны гэты ***экспромт****. Ларыса Геніюш вартая нашай усенароднай пашаны і любові не толькі як паэтэса, але і як Чалавек, Змагар, Патрыёт.*

Хай вечнай і шчырай будзе памяць аб ёй!

Васіль СУПРУН.

* * *

Не дачакала Ты да так жаданай даты,
што край каханы наш
пазбавіла ад пут.
Хацелася ж дажыць, каб бачыць вольным брата,
за што сцярпела шмат
блуканняў і пакут.

Калісьці ў кайданах, між тундры ў свіст завеі
ўпляталі мы цяпло
надзеяў і пяшчот
сваіх змагарскіх мар аб волі.
Імі грэлі
душу і жорсткасць дзён,
хоць быў наўкола лёд.

Цяпер бацькоўскі край скідае груз няволі,
змятае з курганоў
чужацкі пыл маны.
Ды без Цябе, на жаль, усё ідзе паволі.
Сіротамі брыдуць
у новы дзень сыны.

Не дачакала Ты трыумфу сваёй мэты.
Відаць, за многа сіл
аддана барацьбе
за Беларусь.
Яна ж,
між вольных краін свету
пашанай і хвалой
аддзячвае Табе.

Вечарыны

Сустрэча з «Маладосцю»

31 сакавіка ў Доме літаратара адбылася вечарына, прысвечаная 40 гадавіне з дня выхаду першага нумара часопіса «Маладосць». Людзей сабралася багата, сярод іх і знакамітыя пісьменнікі, многія з якіх зрабілі свой першы крок у вялікую літаратуру са старонак «Маладосці». Былі на вечарыне і першыя супрацоўнікі часопіса Янка Брыль і Мікола Аўрамчык. Гэты ветэран, які аддаў 30 гадоў жыцця выя празаікі І. Пташнікаў, В. Адамчык, М. Стральцоў, Л. Дайнека, В. Жук і іншыя, што гэта быў багаты час і на паэзію. Часопіс быў апорай і мастакоў.

І хоць «Маладосць» на працягу 1953—1957 гадоў была невялікага аб'ёму, але знаходзілася месца і добраму вершу, і нарысу, і невялічкаму апавяданню. Калі ж аб'ём часопіса павялічыўся, пачалі друкавацца ўжо і аповесці, і раманы, многія з якіх, дзякуючы А. Твардоўскаму, трапілі на старонкі «Нового мира».

Алесь Асіпенка адзначыў, што якімі б ні былі цяжкімі тыя гады, калі ён працаваў рэдактарам, было ўсё ж і многа радасці, было адчуванне маладосці. Працаваў дружны калектыў, які ўмеў адстаяць добры твор.

Часопіс на чале з П. Панчанкам праявіў сапраўдную сталасць, даўшы свае старонкі такім пісьменнікам, як В. Быкаў, У. Караткевіч і іншыя.

Адметным для «Маладосці» было і тое, што ў ёй з'явілася праўдзівае слова пра нашу гісторыю. І адкрыў яе нам Мікалай Іванавіч Ермаловіч.

Многа па-сапраўднаму каштоўнага было надрукавана ў часопісе. І як справядліва адзначыў М. Ермаловіч, часопіс — гэта брама, праз якую ішлі ў літаратуру новыя сілы паэтаў і празаікаў. А брама гэта была адчынена вялікімі рупліўцамі, кіраўнікамі і супрацоўнікамі часопіса. Яны падавалі руку дапамогі і вялі рэй. Гэта А. Кулакоўскі, А. Асіпенка, П. Панчанка, Г. Бураўкін, В. Зуёнак, А. Грачанікаў, Я. Брыль, І. Грамовіч, М. Аўрамчык, Я. Янішчыц, І. Навуменка, У. Дамашэвіч і іншыя. Часопіс і сёння ў надзейных руках. Калектыў рэдакцыі ўзначальвае вядомы пісьменнік Генрых Далідовіч.

За сваю шматгадовую працу часопіс варты пахвалы, удзячнасці і ўзнагароды. Пахвалу і ўдзячнасць выказваем мы — чытачы. А вышэйстаячыя арганізацыі ўзнагародзілі часопіс граматамі — Саюз пісьменнікаў і Міністэрства інфармацыі.

Добрым дапаўненнем вечарыны быў канцэрт рок-капэлы «Агмень».

Г. ХАТКЕВІЧ.

На здымку: першыя супрацоўнікі часопіса (злева направа — у першым радзе — Я. Васілёнак, І. Грамовіч, Я. Брыль; у другім — А. Кулакоўскі, М. Аўрамчык, В. Грамыка, І. Шаршульскі, І. Рылько, Б. Штольберт) і часты госць рэдакцыі А. Макаёнак.

• Чыталі? •

«Полацак»

Роўна два гады назад у Кліўлендзе (ЗША) выйшаў у свет першы нумар часопіса «Полацак». Прысвечанай гэтай даце нататкай «Два гады» адкрываецца другі нумар «Полацака» за 1993 г.

«Я думаю, што «Полацак» мае свой твар і сваё значэнне ў справе адраджэння беларушчыны» — так пачынаецца адказ Васіля Быкава на запытанне Анатоля Белага пра ролю «Полацака» ў грамадскім і культурным жыцці беларусаў. Інтэрв'ю друкуецца пад загалоўкам «Беларусі патрэбнае кожнае сумленнае слова».

Часопіс працягвае друкаваць тапаграфію знаходак манет і аздобаў Віцебскай вобласці, якую падрыхтаваў Міхась Белямук. Язэп Юхо прапануе працяг «Кароткага нарыса гісторыі дзяржавы і права Беларусі». На гэты раз размова ідзе пра Крэўскую і Гарадзельскую уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. «Да пытання этнічнай прыналежнасці старажытных ліцвінаў» — так называецца артыкул П. Урбана. Пра стварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў сакавіку 1918 года распавядаюць М. Сташкевіч і Р. Платонаў. С. Белая ў рубрыцы «Памяць зямлі» працягвае знаёміць з расказамі віленскіх беларусаў пра святкаванне 25 сакавіка. Часопіс змяшчае некалькі штрыхоў А. Шукелойца да партрэта Анатоля Бярозкі, а таксама ўспаміны М. Рэпкава-Смаршчка «Крыху пра Язэпа Пушчу ды ягоныя «Лісты да сабакі».

У 1985 годзе ў каледжы Ля Гвардыя ў Нью-Йорку адбыўся сімпозіум, прысвечаны пытанню «Паэты вонках плыні», дзе выступіў Масей Сяднёў. «Полацак» знаёміць з яго выступленнем.

У нататках «Туды, дзе нашыя карані» Святлана Белая распавядае пра ўражанні ўдзельнікаў хору «Васілёк», якія ў мінулым годзе наведвалі з канцэртамі Беларусь, а Адам Мальдзіс — пра сустрэчу кіраўніцтва Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны і выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», на якой было дамоўлена супольнымі сіламі падрыхтаваць і выдаць энцыклапедычны даведнік «Беларусы ў свеце». З літаратурных твораў у «Полацаку» змешчаны вершы В. Супруна, С. Сачанкі, С. Лепіна і восьмая быліца М. Кавыля «З агню ды ў полымя».

В. Ш.

Усё пачынаецца з калыскі

У гэтым глыбока пераканана настаўніца Вузлянскай школы Алена Сямёнаўна Хіла. Усё ў чалавеку — характар, здольнасці, схільнасці і звычкі бяруць выток з ранняга дзяцінства, першых уражанняў чалавека, таго духоўнага паветра, якім ён дыхае ў сямейным асяродку.

Перакананне гэта зусім не тэарэтычнае. Калісьці яна сама, яшчэ люляючыся ў калысцы і толькі пачынаючы ўспрымаць навакольны свет, чула пяшчотную песню маці, бачыла перад сабой узорныя дываны і срабрыстыя ручнікі яе работы, якімі была аздоблена хата.

Зараз у падобнай на тую вясковай хаціне — створаны Аленай Сямёнаўнай і яе сябрамі этнаграфічны музей з пакоем старога сялянскага побыту. У ім усё так, як было даўней: беленая печ, стол з лаваю, ахінуты ручнікамі абраз на покуці. Узорныя дываны на сценах. А пасярэдзіне — пацямнелая ад часу драўляная калыска-гойданка. Тая самая, што люляла маленькую Аленку, цяпер Алену Сямёнаўну, паважаную ў вёсцы і наваколлі.

У памяшканні школы, дзе працуе ветэран педагагічнай нівы, — своеасаблівы працяг музейнай экспазіцыі: цікавая выстава традыцыйнага народнага мастацтва і дзіцячай творчасці. У мясцовых старажылаў, ва ўласных сем'ях расшуквалі настаўнікі і вучні, заахвочаныя няўрымслівай Аленай Сямёнаўнай, дзівосныя ўзоры ткацтва, разьбы, саломапляцення. Многае зроблена ўжо цяпер уласнымі рукамі, падказана ўласнай фантазіяй і ўносіць цяплінку хараства ў школьны інтэр'ер, сучаснае жытло вяскоўцаў. Ну, а прылады сялянскай працы і даўняга хатняга ўжытку — сярпы, таўкачы, калаўрот і нават... ступа нярэдка становяцца «дзейнымі асобамі» народных святаў і абрадаў, тэатралізаваных прадстаўленняў, якія наладжвае вядомы далёка за межамі Мядзельшчыны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Вузлянка». Яе завадатар і нязменны кіраўнік — тая ж самая Алена Сямёнаўна Хіла, дзякуючы якой мясцовая васьмігодка стала сапраўдным цэнтрам сельскай культуры, школай выхавання ў дзятвы і дарослых цікавасці і любові да багатай спадчыны продкаў.

...Канчаюцца ўрокі — настаўніцкая ператвараецца ў музычны клас. Якраз тут сярод захопленых народнай творчасцю людзей, і завязаўся вузельчык «Вузлянкі». І зараз перад чарговай рэпетыцыяй у цеснаце, ды не ў крыўдзе ўладкаваліся сябры гурта. Побач з ветэранамі настаўніцкага і фальклорнага калектываў — Надзеяй Васільеўнай Мішчанкай, Таццянай Рыгораўнай і Віктарам Ціханавічам Купрэвічамі, Зінаідай Кірылаўнай Тачыцкай, Галінай Уладзіміраўнай Балаховіч — іх маладзейшыя паплечнікі і былыя вучні: Аліна Шульжыцкая, Ганна Батура, Антаніна Жыгалюк, Таццяна Пішч.

Алена Сямёнаўна дае знак, і адмысловы гарманіст Леанід Антонавіч Чарапок перакідвае рамень цераз плячо. На імгненне ў пакоі ўсё сціхае. І з гэтай цішыні — а мо з празрыстага паветра за акном, з глыбінь самой зямлі, што абуджаецца ад зімовага сну, нараджаецца і струменіць ціхі, задумлівы ручай песні.

А ў полі тры кранічанькі,
Там стаялі тры дзяўчынанькі:
Чарнявая, бялявая,
Трэцяя руса-кучаравая...

Пранікнёныя галасы зліваюцца ў адно рэчышча, агортваюць светлым сумам. Песня родная, змалку любая не «выконваецца» — вылятае з-пад самога сэрца. Яны з ёй раслі і зараз, у час агрэсіўна-разбуральнага наступу антыкультуры, не збіраюцца даваць ёй адстаўку. Бо яна — сама чысціня, паэзія і мудрасць, «мода» на якія ніколі не састарэе, была і будзе вечнай.

Колькі яшчэ неацэненых дыяментаў, ледзь не забытых неабачлівымі нашчадкамі, рассыпана ў народнай памяці, чакае свайго адкрыцця. Міма іх не пройдуць абыякава збіральнікі і захавальнікі фальклору з мядзельскай вёскі Вузла. Неяк у суседніх Альсевічах даведаліся яны пра паэтычны звычай продкаў — вясельны абрад «Каравай». Па драбніцы расшуквалі і ўзнаўлялі з ацалелых фрагментаў прыгожае народнае свята. Колькі ж было радасці людзям, калі настаўнікі прыйшлі з «Караваем» на вясковае вяселле!

Невычэрпную песенна-абрадавую спадчыну ўзялі ў свой рэпертуар пачынальнікі і прадаўжальнікі творчага народнага гурта. Ходзяць і ходзяць яны па навакольных вёсках, знаходзячы і вяртаючы да жыцця ў выглядзе яркіх тэатралізаваных дзействаў цэлыя цыклы народных каляндарных, працоўных, абрадавых святаў і гульняў, заснаваных на мясцовых звычаях і традыцыях. Тут і каляды, і'гуканне вясны, зажынкі і дажынкі, вясёлыя «Вечарушкі», з якімі яны наведваліся ў хаты старых людзей, якім ў клуб цяжка выбрацца. Калі ж калядуюць, ніводзін двор не прамінуць, інакш крыўды не абярэшся...

Слёзы радасці на вачах, словы падзякі на вуснах — так сустракаюць і праводзяць дарагіх гасцей землякі. Разам з матчынай песняй вяртаецца іх маладосць, ураскрасае надзея на лепшае.

...Алена Сямёнаўна згадвае, як аднойчы зімовым надвячоркам сабралася ў далёкую вёсачку да бабкі Тэклі — жывой скарбонкі даўніх песень, дасціпных жартаў, казак, прымавак.

— Іду ад шасейкі, у гурбах патанаю. А мароз-мароз, хутчэй бы да жытла дабрацца. Ды яшчэ ледзь не пудовы, дапатопны магнітафон рукзак на плячах адцягвае. Урэшце, увальваюся ў хату. А бабуля — вось неспадзеўка — захутаная ў коўдру ў ложку ляжыць, занядужала. Што тут будзеш рабіць? Тоесёе ўпарадкавала ў хаце, есці згатавала ды стала назад збірацца. Гаспадыня ж расхвалявалася, заўпарцілася: «Не думай, не пушчу. Стаў свой нітахфон, калі ўжо ўспомніла старую. Заспяваю — палегчае, вось убачыш...»

Так яно і было. Як добра, што паспела тады яе запісаць. Праз нейкі час не стала бабкі Тэклі, а песні яе жывуць.

...Семнаццаць год чаруе сваім мастацтвам, што ад каранёў роднае зямлі, спеўны гурт «Вузлянка». Чаруе не толькі жыхароў свайго раёна. З поспехам выступаў на шматлікіх творчых конкурсах і фестывалях, на Беларускім тэлебачанні, перад аматарамі фальклору ў Латвіі і Польшчы. А побач з настаўнікамі падымаецца новая змена прыхільнікаў народнай творчасці — вучнёўскі фальклорны ансамбль, спадарожнік «Вузлянкі». Яблыка ад яблыні недалёка коціцца...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.
Мядзельскі раён.

На здымку: Алена Сямёнаўна ХІЛА.

«Наша слова» — газета для тых, хто за незалежную дэмакратычную Беларусь.

«Наша слова» — гэта разнастайная інфармацыя пра дзейнасць ТБМ

— штотыднёвы кампакт звестак пра самыя істотныя палітычныя і культурныя падзеі ў Беларусі

— паведамленні аб культурным жыцці беларускага замежжа — беларусазнаўства, радавод

— усё пра мову — яе гісторыю, існаванне і развіццё

— пытанні правапісу

— слоўнікі, размоўнікі

— літаратурныя навіны, успаміны.

«Наша слова» — газета для тых, хто паважае шляхетнасць і адукаванасць.

Калі за адраджэнне мовы, чытай, спадарства, «НАША СЛОВА»!

Падпісная цана на 1 месяц — 18 рублёў
на 3 месяцы — 54 рублі
на 6 месяцаў — 108 рублёў.
Індэкс «НАШАГА СЛОВА» — 63 865.

І смех і грэх

Мікола ВЯРШЫНІН

Мураш і Слон

(байка)

Мураш лічыў сябе дужэйшым за Слана:
Той не падыме груза, як ён сам.
Мураш падыме Мураша —
вядома ўсім здаўна,
Куды з ім сілай мерацца Сланам!
І вось рашыў саманадзейна, што пара
Уперціся і камень тут звярнуць.
Ад тупату Слана
каменьчык скінуўся з бугра,
І не паспеў Мураш
ні ўверх, ні ўніз зірнуць...

—»—

Не пераацані свае ты сілы,
Глядзі, каб каменем цябе
не раздушыла.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ

Аксіёма

(Маім сябрам з БНФ)

Будзь якім хочаш лоўкім дыпламатам —
Не здужыш чалавека з аўтаматам...
Будзь хоць самім Зянонам Пазьняком —
Перад стралковым не ўстаіш палком...

Манкурцізм

Што падумаць могуць госці
Аб краіне і народзе,
Калі з могільніка косці
Раскіданы ў агародзе...

Афарызмы

Петар ЛАЗІЧ

Мяркуючы Каіну і Авелю, людзі ўсё ж такі браты.

Важна, што мы забяспечылі няздольных. Здольныя самастойна выкараскаюцца.

Наш шлях сапраўды непаўторны. Нікому не ўзбрыло б у галаву ісці ім.

Адысей хоць сам блукаў. Ітаку не вадзіў за сабою.

Сутыкненне інтэлігенцыі і ўлады надуманае. Інтэлігенцыя ніколі не знявольвала тых, хто ва ўладзе.

Шукаем новага чалавека! Жывога ці мёртвага!

Тым, хто слаба разбіраецца ў кнігах, прыдуманы кніжачкі.

Мы жывём у перадавым грамадстве. Большага не заслужылі.

Дзе-хто сцвярджае, што ў мяне няма ніякіх здольнасцей. Таварышы, гэта контрэвалюцыя!

Дагэтуль філосафы парознаму вытлумачвалі свет, а цяпер стаіць задача, каб іхнія тлумачэнні прывесці да аднолькавасці.

Моладзь — наша будучыня, бо ў сучаснасці ім няма чаго рабіць.

Падмуркі хісткія, але астатняе збудаванне аж трашчыць ад моцы.

Чым меней чытаю, тым болей мне застаецца часу крытыкаваць прачытанае.

Свабоды творчасці? Калі ласка. Толькі без асацыяцый.

Тэорыя дала «Капітал». Практыка «Міф пра Сізіфа».

Напачатку быў працаўнік, а потым у яго развілася класавая свядомасць.

Пераклаў з сербскахарвацкай Іван ЧАРОТА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп — адказны сакратар.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф. Скарыны.
Наш адрас: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.
Індэкс 63865.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара неабавязкова можа адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае. Наклад **8614** паасобнікаў.

Падпісана ў друк 23.04.1993 г. у 15 гадзін.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
220079, г. Менск, 1-ы Загарадны завулак, 3.

Зак. 269.